ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 46 (5052) 29 лістапада 2019 г.

ISSN 0024-4686

16+

Мінск — Тбілісі: культурны патэнцыял стар. 5

Такія розныя вобразы... стар. 6

Алесь Карповіч: рэдактар, асветнік стар. 14

Па старонках гісторыі

Нацыянальнаму мастацкаму — 80, альбо Невядомыя факты пра галоўную культурную скарбніцу краіны

Фота Кастуся Дробава.

Наша стагоддзе здольнае здзіўляць неверагодным тэхнічным прагрэсам, уражваць магчымасцямі і дасягненнямі грамадства ў розных сферах. Але жыццё хутка змяняецца, мы нават не заўсёды можам злавіць момант, калі надвор'е стала іншае. Напэўна, адзінае, што дае адчуць супакаенне ці, наадварот, узрушэнне, — мастацтва, якое ў кожны перыяд развівалася па-рознаму, але, тым не менш, засталося вечным.

Сёлета Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі споўнілася 80 гадоў. Да гэтага часу ён стаў адным з найбагацейшых музеяў Усходняй Еўропы, набыў значны статус. Яго збор налічвае больш за 30 тысяч экспанатаў, якія фарміруюць 20 разнастайных калекцый і складаюць два галоўныя музейныя зборы: нацыянальнага мастацтва і помнікаў мастацтва краін і народаў свету. Экспануючы і рэстаўрыруючы мастацкія творы, наша культурная скарбніца папулярызуе мастацкую спадчыну краіны.

Працяг на стар. 12—13 ►

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 19046

акцэнты тыдня

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў часопіса «Алеся» з 95-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара айчыннага выдання для жанчын. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за гады існавання часопіс некалькі разоў мяняў назву, але не страціў сваёй сутнасці. Як і дзесяцігоддзі таму, ён паспяхова спрыяе паляпшэнню становішча жанчын у грамадстве, паказвае іх як актыўных удзельніц палітычнага, сацыяльнага і культурнага жыцця краіны. «Не будзе перабольшаннем сказаць, што "Алеся" сфарміравала некалькі пакаленняў беларусак — энергічных, дасведчаных і адказных. Выданне і сёння робіць важкі ўнёсак у стварэнне светлага, высакароднага вобраза беларускай жанчыны, выхаванне нашай моладзі і папулярызацыю сямейных каштоўнасцей», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Юбілей. Прэзідэнт Беларусі таксама павіншаваў народную артыстку РСФСР Галіну Польскіх з юбілеем. «Дзякуючы непаўторнаму творчаму стылю, мастацкай выразнасці і праўдзівасці створаных вобразаў вы заслужылі шчырую павагу калег і любоў публікі», — гаворыцца ў віншаванні. «Няхай ваша работа і ў далейшым дорыць гледачам радасць і добры настрой, аб'ядноўвае людзей розных пакаленняў, садзейнічае ўмацаванню дружбы паміж народамі Беларусі і Расіі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Вынікі. Брэст завяршае сваё знаходжанне ў ганаровым статусе культурнай сталіцы Садружнасці, паведамілі ў Міждзяржаўным фондзе гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. За гэты год горад прыняў каля ста музычных, адукацыйных і тэатральных праграм з удзелам творчых калектываў з розных краін СНД, многія з якіх адбыліся ўпершыню. Сярод найбольш яркіх — фестываль хароў хлопчыкаў «Берасцейскія асамблеі», харэаграфічны фестываль «Танцавальная вясёлка», канферэнцыя бібліятэкараў дзяржаў СНД і іншыя. Заключным акордам памятнага года стане ўрачыстая цырымонія, якая адбудзецца 9 снежня ў Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы імя Ленінскага камсамола Беларусі. Тут эстафету Брэста прыме казахстанскі Шымкент, які стане культурнай сталіцай Садружнасці ў 2020 годзе.

Стасункі. Інфармацыйнае агенцтва БелТА возьме ўдзел у падрыхтоўцы маштабнай фотавыстаўкі ТАСС «Прэса на вайне», паведаміла генеральны дырэктар агенцтва Ірына Акуловіч падчас XXVII пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаўных інфармацыйных агенцтваў СНД у Маскве. Ужо перададзены некалькі дзясяткаў унікальных здымкаў. Інфармагенцтва таксама падрыхтавала шэраг праектаў, прысвечаных Вялікай Перамозе. Сярод іх — «Партызанскі летапіс», які складаецца з 248 рукапісных часопісаў партызанаў, пераведзеных у лічбавы фармат і даступных на шасці мовах. Хутка выйдзе кніга «Героі партызанскага краю» пра партызанаў-падпольшчыкаў, рыхтуецца праект «Лёсы, складзеныя ў трохкутнік».

Мова. У Доме кнігі «Светач» адкрыўся апорны пункт выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі». Да гэтай падзеі была прымеркавана і прэзентацыя новай кнігі Сяргея Зелянко «Этыкет па-беларуску» з серыі «Таямніцы беларускай мовы». Серыя была заснавана ў 2017 годзе з мэтай папулярызацыі вывучэння беларускай мовы малодшымі школьнікамі, фарміравання пачуцця павагі да роднай мовы. Дарослыя таксама змогуць адкрыць для сябе шмат цікавага ў свеце мовы. Кожная кніга серыі — своеасаблівы квэст з карыснай інфармацыяй і займальнымі заданнямі. Ужо выйшлі ў свет кнігі «Словы-дзедкі і словы-дзеткі: гістарызмы і неалагізмы», «Адным словам не сказаць: безэквівалентная лексіка», «Знаёмыя незнаёмцы: сакрэты літар» і іншыя. Выданні гэтай унікальнай серыі напісаны простай, зразумелай мовай.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

стасункі

Помнік Янку Купалу

адкрылі ў балгарскім горадзе Пліска

З'явіўся пастамент народнаму паэту Беларусі ў гісторыка-культурным комплексе «Двор кірыліцы». У цырымоніі адкрыцця бралі ўдзел Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Балгарыя Аляксандр Лукашэвіч і дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч. Аўтар бюста — скульптар Уладзімір Слабодчыкаў.

Па традыцыі пастамент бюста пасыпалі зямлёй з радзімы пісьменніка. Бюст Янку Купалу з'явіўся на алеі пісьменнікаў, сярод якіх — Ёрдан Ёўкаў, Аляксандр Тэадораў-Балан і Агоп Мелканян з Балгарыі, Леанід Гурунц з Арменіі, Абузар Айдаміраў з Чачэнскай Рэспублікі (Расія) і іншыя. Ініцыятар стварэння «Двара кірыліцы» — балгарскі мецэнат Карэн Алексанян.

Цікава, што Янка Купала не першы беларускі пісьменнік, які быў ушанаваны ў гісторыка-культурным комплексе «Двор кірыліцы». Некалькі гадоў таму там усталявалі мемарыяльную дошку Янку Маўру работы скульптара Валерыя Жалязкова. Гэта першы мемарыяльны знак пачынальніку беларускай дзіцячай літаратуры за межамі нашай краіны.

Васіліна МІЦКЕВІЧ

Фота rus.by.

Падчас адкрыцця помніка Янку Купалу ў г. Пліска.

прэзентацыя

Час роднага слова

У выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» пабачыў свет чарговы том энцыклапедыі, прысвечаны беларускай літаратуры.

Восьмы том з запланаванай 12-томнай «Энцыклапедыі для школьнікаў і студэнтаў», пачатак якой быў пакладзены ў 2009 годзе, прэзентавалі ў прэс-цэнтры Дома прэсы. Найбліжэйшыя выданні, якія ўжо плануюцца, будуць прысвечаны рускай мове і літаратуры.

Том «Беларуская літаратура» падрыхтаваны выкладчыкамі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка згодна з рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У аўтарскі калектыў увайшлі Т. Тарасава, І. Мішчанчук, Т. Хоміч, Н. Заяц, Т. Ганчарова-Цынкевіч, С. Сычова, М. Рак і іншыя. Дарэчы, гэта не першая сумесная праца з педагагічным універсітэтам: раней выйшаў том «Беларуская мова». Выданне, адрасаванае вучням старшых класаў сярэдніх школ, гімназій, ліцэяў і студэнтам першых курсаў філалагічных факультэтаў ВНУ, будзе цікава ўсім аматарам беларускай літаратуры. Як і мінулыя выданні, том выйшаў накладам у тысячу экзэмпляраў.

Прадстаўнікі аўтарскага калектыву «Беларускай літаратуры» прэзентуюць выданне.

Структурна «Беларуская літаратура» складаецца з трох частак. Першая змяшчае тэарэтычныя артыкулы, што тычацца гісторыі развіцця беларускай літаратуры ад старажытнасці да нашых дзён. Другі блок прысвечаны персаналіям, якія вывучаюцца ў старшых класах школы і на першых курсах ВНУ. Трэцяя частка — слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў, падрыхтаваны доктарам філалагічных навук, прафесарам, выкладчыкам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Вячаславам Рагойшам. Акрамя таго, у канцы выдання прыведзены бібліяграфічны спіс.

— Літаратура ў томе падаецца як частка культуры, як частка развіцця грамадства, — зазначыла Святлана Сычова, намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце, старшы выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры філалагічнага факультэта БДПУ імя М. Танка. — У глабальным плане літаратура адлюстроўвае дух часу, і гэта мы імкнуліся паказаць, у тым ліку праз сувязь літаратуры з іншымі відамі мастацтва. Таксама вельмі важным для нас было падкрэсліць шматмоўнасць літаратуры: усё ж у нас ёсць творы і на рускай, і на польскай мовах.

Дарэчы, энцыклапедыя не засяроджваецца выключна на класіках, але дае паняцце і пра падзеі і асобы сучаснага літаратурнага працэсу. Укладальнікі арыентаваліся на школьную праграму і імкнуліся пашырыць яе. Сярод сучасных творцаў, якія ўключаны ў раздзел «Пісьменнікі», — Святлана Алексіевіч, Мікола Шабовіч, Віктар Жыбуль, Міхась Башлакоў ды іншыя.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

зваротная сувязь

Паэтычная раніца запрашае...

Сумесная з выдавецтвам «Мастацкая літаратура» праграма «Кнігалюбу», што выходзіць на канале «Культура» Беларускага радыё ў суботу, прапануе гаворку пра шматтомнік Уладзіміра Караткевіча і новую кнігу «Вобілюманс» Уладзіміра Навумовіча. Будуць у перадачы праанансаваны і крытычныя старонкі штотыднёвіка «ЛіМ».

У публіцыстычным праекце «Запрашаем у кнігарню», што выходзіць у нядзелю, пойдзе размова пра кнігі Юрыя Кур'яновіча і навуковую канферэнцыю ў Полацку, прысвечаную спадчыне Сімяона Полацкага.

Радыёверсію тэлепраграмы «Суразмоўцы» можна пачуць на канале «Культура» па нядзелях. Вядучы Навум Гальпяровіч прапануе сустрэчу з паэтэсай Настай Кудасавай.

Вершы Людмілы Клачко прагучаць у выхадныя ў праграме «Паэзія XXI стагоддзя». Аматарам вершаванай спадчыны канал «Культура» таксама ў выхадныя прапануе праект «Паэтычная раніца». Прагучаць радыёкампазіцыі паводле вершаў Дануты Бічэль-Загнетавай і беларускіх паэтаў пачатку XX стагоддзя.

Апавяданні Антона Чэхава «Тоўсты і тонкі», Міхася Стральцова «Падарожжа за горад» і навела Якуба Коласа «Вадаспад» прагучаць у выхадныя ў межах перадачы «Літаратурныя гісторыі».

Аматарам тэатра перад мікрафонам у суботнім эфіры праграма «Радыётэатр. Лепшае» (да 100-годдзя Купалаўскага тэатра) прапануе радыёкампазіцыю спектакля тэатра імя Янкі Купалы «Даходнае месца» па аднайменнай п'есе Аляксандра Астроўскага. Нядзельным вечарам у праграме «Радыётэатр плюс» можна паслухаць радыёспектакль па творы Генры Слезара «Крык у начы».

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

***30 лістапада** — на імпрэзу ў бібліятэку Цэнтральнага Дома афіцэраў з удзелам Міхася Пазнякова і Людмілы Воранавай (11.00).*

***3 снежня** — у Школу юнага паэта пры аддзяленні СПБ (вул. Фрунзэ, 5, каб. 309) (14.30).*

***5 снежня** — на сустрэчу з паэтэсай Лізаветай Палеес у СШ № 126 (15.00).*

***6 снежня** — на сустрэчу з рэжысёрам Тэатра паэзіі Святланай Яфрэмавай у бібліятэку № 1 імя Л. Талстога (17.30).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***3 снежня** — на вечарыну «Дар душэўнай дабрыні» з удзелам Ірыны Радзіхоўскай, прысвечаную 120-годдзю з дня нараджэння Міхася Лынькова, у Віцебскую бібліятэку № 11 імя М. Лынькова (15.00).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***4 снежня** — на літаратурную сустрэчу «Гудзевічы — здаровы аграгарадок» з удзелам Людмілы Кебіч, Мікалая Іваноўскага, Ганны Скаржынскай-Савіцкай і Таццяны Лазарчык у Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей (Мастоўскі раён) (15.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***30 лістапада** — на літаратурную вечарыну-партрэт «Шчодрае сэрца творцы» з нагоды 120-годдзя з дня нараджэння Міхася Лынькова з удзелам Міколы Леўчанкі ў Быхаўскую раённую бібліятэку (11.00).*

***2 снежня** — на літаратурную вечарыну «Кветкі Багародзіцы» па творчасці Ніны Кавалёвай, прысвечаную Міжнароднаму дню інвалідаў, у Горацкую дзіцячую школу мастацтваў і вакальна-харавога майстэрства (вул. Якубоўскага, д. 40, актавая зала «Прытулачак») (12.00).*

культурная прастора

Пушкініст з Ваўкавыска

Сёлета адзначыла юбілей руская пісьменніца Ларыса Чаркашына, якая нарадзілася ў Ваўкавыску.



Сям'я яе была ўнікальная: бацька — ваенны будаўнік, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, цяжка паранены пад Віцебскам. Пасля вайны служыў у розных мясцінах Беларусі. Будаваў вайсковыя гарадкі ў Ваўкавыску, Шчучыне, Смаргоні, Слоніме, Баранавічах. «Дамы Чаркашына» і зараз стаяць у розных куточках Беларусі... Захапленнем жа Андрэя Чаркашына было складанне радаводу Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. На гэтую тэму былы вайсковец выдаў адмысловую, насычаную багатай інфармацыяй кнігу.

Андрэй Чаркашын — заслужаны работнік культуры Расійскай Федэрацыі. А родны брат Ларысы Андрэеўны Мікалай Чаркашын (ён таксама нарадзіўся ў Ваўкавыску) — вядомы не толькі ў Расіі, але і далёка за яе межамі пісьменнік-марыніст. Капітан I рангу, аўтар дзясяткаў кніг, у тым ліку — і рамана пра гераічную абарону Брэсцкай крэпасці.

У 1962 годзе сям'я Чаркашыных пераехала ў Маскву. З 1970 года Ларыса Чаркашына актыўна выступае ў перыядычным друку. Захапленне жыццём і творчасцю Аляксандра Пушкіна перайшло да яе ў спадчыну ад бацькі. Наша зямлячка — член Саюза пісьменнікаў Расіі, член Усерасійскага Пушкінскага таварыства. За плённую даследчыцкую працу прэзідэнт Расійскай Федэрацыі адзначыў яе медалём А. С. Пушкіна.

Ларыса Чаркашына — аўтар кніг «Тысячагадовае дрэва А. С. Пушкіна: карані і крона» (у суаўтарстве з бацькам), «Вянок Наталі», «Таямніцы пушкінскага дрэва», «Пушкін і Наталі», «Патаемны Пушкін: позірк з XXI стагоддзя», «Апошняя дуэль ці за што забілі Пушкіна» і многіх публікацый у газетах і часопісах. Пісьменніца стварыла сцэнарыі шэрагу мастацка-дакументальных фільмаў: «Наталі. Тры жыцці Наталлі Ганчаровай», «Пад небам Шылера і Гётэ», «Напоўнены верай і любоўю», «Прывітанне, Вульф, сябра мой!»…

Ларыса Андрэеўна часта выступае з дакладамі, лекцыямі, паведамленнямі на пушкінскіх урачыстасцях, канферэнцыях у Расіі, Японіі, Даніі, Чарнагорыі, Францыі, на Мальце, на Пушкінскіх святах паэзіі ў Міхайлаўскім (Пскоўская вобласць). У кастрычніку 1999 года брала ўдзел у міжнароднай канферэнцыі «Пушкін і Грэцыя», якая ладзілася ў Афінах. У лістападзе 2009 года была запрошана на адкрыццё Першага сусветнага з'езда нашчадкаў А. С. Пушкіна...

Будзем спадзявацца, што Ларыса Чаркашына завітае і ў Беларусь, у мясціны, звязаныя з лёсам Аляксандра Пушкіна і яго нашчадкаў.

Мікола БЕРЛЕЖ

праекты

«Галька» — на сталічным экране

як даніна павагі Станіславу Манюшку



Спецыяльны паказ драмы Канстанты Мягліцкага «Галька», прымеркаваны да 200-годдзя з дня нараджэння Станіслава Манюшкі, адбудзецца 6 снежня ў межах праекта «КІНЯМО. Нямое кіно + жывая музыка» ў сталічным кінатэатры «Масква». Паказ арганізаваны пры ўдзеле Польскага інстытута ў Мінску і Нацыянальнага кінаархіва ў Варшаве.

Экранізацыя аднайменнай оперы, якая выйшла на экраны ў 1929 годзе, будзе прадстаўлена ў музычным суправаджэнні, створаным кампазітарам Вольгай Падгайскай, спецыяльна для адноўленай версіі кінастужкі. Жывы акампанемент беларускай прэм'еры «Галькі» забяспечаць салісты Вялікага тэатра Беларусі Ірына Кучынская і Андрэй Кліпо, харавая капэла, калектыў новай камернай музыкі *Five-storey ensemble*.

«Галька» — адна з трох польскіх даваенных экранізацый оперы Станіслава Манюшкі, якая распавядае пра няшчаснае каханне вясковай дзяўчыны да паніча Януша. Кінастужка не з'яўляецца дакладнай адаптацыяй твора Манюшкі: пры распрацоўцы сцэнарыя Ежы Браўн выкарыстаў толькі асноўныя матывы лібрэта. У 1932 годзе па рашэнні прадзюсара фільм быў агучаны ў адпаведнасці з тагачаснай практыкай: уласцівыя для нямога кіно інтэрцітры захаваліся, а да асобных сцэн дадаткова стварылі так званыя спеўна-музычныя ілюстрацыі. Разам з арыямі і харамі з арыгінальнай оперы ў новай версіі гучалі фрагменты твораў Фрыдэрыка Шапэна, Войцэха Асманьскага, Эдварда Грыга, Рыхарда Эйленберга і народныя мелодыі.

Да нядаўняга часу нямая экранізацыя «Галькі» была не вельмі вядома: з арыгінальнай версіі захаваліся толькі апошнія чатыры хвіліны. У зборах Нацыянальнага кінаархіва ў Варшаве знайшліся вялікія фрагменты працоўных матэрыялаў да больш позняй гукавой версіі. Пры гэтым гукавая дарожка захавалася толькі часткова. Рэстаўрацыя «Галькі» — адна з найскладанейшых задач, з якой сутыкнуўся польскі кінаархіў.

Ствараючы музычнае суправаджэнне да адноўленай версіі «Галькі», Вольга Падгайская імкнулася прадставіць гледачам сучаснае прачытанне нямой стужкі, напоўніць яе актуальным зместам, але ў той жа час аддаць даніну павагі Станіславу Манюшку як пачынальніку польскай і беларускай опернай традыцыі, уключыўшы ў партытуру фрагменты арыгінальнай оперы. Вынікам стаўся новы твор, своеасаблівы сімбіёз кіно і оперы, адметны моцнай драматургіяй і сімфанічнай глыбінёй.

Міра ІЎКОВІЧ

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5 гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу з далейшым заключэннем кантракта ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

1	кафедра фартэпіяна	— дацэнт (1,0 шт.адз.)
2	кафедра баяна і акардэона	— дацэнт (1,0 шт. адз.)
3	кафедра канцэртмайстарскага майстэрства	— старшы выкладчык (1,0 шт.адз.)
4	кафедра гісторыі музыкі і музыкальнай беларусістыкі	— старшы выкладчык (1,0 шт.адз.)
5	кафедра опернай падрыхтоўкі і харэаграфіі	— дацэнт (1,0 шт.адз.) фурман
6	кафедра драўляных духавых інструментаў	— дацэнт (1,0 шт.адз.)
7	кафедра сацыяльна-гуманітарых дысцыплін	— старшы выкладчык (2,0 шт.адз.)
8	кафедра спеваў	— дацэнт (1,0 шт.адз.)
9	кафедра струнных народных шчыпкова-ўдарных інструментаў	— дацэнт (1,0 шт.адз.)—
10	кафедра аркестравага дырыжыравання і інструментоўкі	— загадчык кафедрай (1,0 шт.адз.)
11	кафедра струнных смычковых інструментаў	— дацэнт (1,0 шт.адз.)

ЛіМ КАЛЯНДАР

120 гадоў з дня нараджэння Паўла Жука (1899—1924), дзеяча беларускага нацыянальнага культурнага руху ў Маскве.

95 гадоў таму (1924) пачаў выходзіць грамадска-публіцыстычны мастацкі часопіс для жанчын і сям'і «Алеся». Да 1995 г. меў назву «Работніца і сялянка».

80 гадоў таму (1939) створаны ў Беластоку Дзяржаўны польскі тэатр БССР. У 1940 г. працаваў у Гродне. Існаваў да 1941 г.

65 гадоў таму (1954) створаны заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Гомельскі абласны драматычны тэатр».

30 лістапада 55 гадоў спаўняецца Тамары Мазур, паэтэсе, публіцыстцы.

30 лістапада — 120 гадоў з дня нараджэння Міхася (Міхаіла) Лынькова (1899—1975), празаіка, дзіцячага пісьменніка, літаратуразнаўца, сцэнарыста, грамадскага дзеяча, народнага пісьменніка БССР.

30 лістапада 85-гадовы юбілей святкуе Віктар Шчарбакоў, графік, мастак.

1 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Дамарада (1919—2005), графіка.

1 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Ніны Ражновай (1919—2006), піяністкі, заслужанай артысткі БССР.

2 снежня — 140 гадоў з дня нараджэння Фелікса Стацкевіча (1879—1967), грамадскага і культурнага дзеяча, мемуарыста, выдаўца, педагога.

2 снежня — 95 гадоў з дня нараджэння Яўгена Дзягцярыка (1924—2001), кампазітара.

2 снежня 80-годдзе адзначае Валерый Гукасаў, майстар дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, афарміцель.

3 снежня 60 гадоў спаўняецца Таццяне Баўкалавай, актрысе.

4 снежня — 145 гадоў з дня нараджэння Льва Альпяровіча (1874—1913), мастака.

4 снежня — 115 гадоў таму (1904) пачала выдавацца ў Мінску грамадска-палітычная і літаратурная газета «Белорусский вестник». Выдавалася да 1905 г.

4 снежня — 105 гадоў з дня нараджэння Рыгора Няхая (1914—1991), паэта, празаіка.

4 снежня — 60 гадоў з дня адкрыцця (1959) Літаратурнага музея Якуба Коласа ў Мінску.

5 снежня — 95 гадоў з дня нараджэння Віктара Трасцянскага, паэта, празаіка.

6 снежня — 120 гадоў з дня нараджэння Барыса Мардвінава (1899—1953), расійскага і беларускага рэжысёра, педагога, заслужанага артыста РСФСР. У 1947—1951 гг. — галоўны рэжысёр Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі.

6 снежня 80-гадовы юбілей святкуе Тамара Мужэнка, актрыса тэатра і кіно.

6 снежня 70-годдзе адзначае Надзея Еўчык, мовазнаўца.

6 снежня 55 гадоў спаўняецца Юрыю Максіменку, драматургу, празаіку.

люстэрка тыдня

Адбылася сустрэча Пасла Беларусі ў Іспаніі Паўла Пуставога з рэктарам Універсітэта імя караля Хуана Карласа (г. Мадрыд, Іспанія) Хаўерам Рамасам Лопэсам, паведамілі ў пасольстве. Пасол Беларусі праінфармаваў суразмоўцу пра сістэму вышэйшай адукацыі ў нашай краіне, пра кірункі развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. Рэктар выказаў думку аб усталяванні сувязей з Беларускім дзяржаўным універсітэтам як з адной з вядучых навучальных устаноў вышэйшай адукацыі ў Беларусі. Падчас сустрэчы суразмоўцы абмеркавалі магчымасць стварэння цэнтра эталоннай прававой інфармацыі на базе юрыдычнага факультэта Універсітэта імя караля Хуана Карласа. Дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб правядзенні кансультацый паміж экспертамі ўжо ў снежні.

Міжнародны камерны аркестр *East-West Chamber Orchestra* пад кіраўніцтвам вядомага беларускага піяніста і дырыжора Расціслава Крымера напярэдадні канцэрта ў адной з цэнтральных залаў Стамбула быў запрошаны на аўдыенцыю Усяленскім Патрыярхам Варфаламеем, паведамілі ў Пасольстве Беларусі ў Турцыі. Патрыярх Варфаламей выказаў удзячнасць сусветна вядомым музыкантам — маэстра і яго аркестру — за іх агульны ўклад у еднасць людзей і народаў з дапамогай музычнага мастацтва. Аркестр выканаў два творы Пятра Чайкоўскага, стаўшы такім чынам першым у гісторыі Канстанцінопальскага Патрыярхата, хто быў удастоены права выступіць у яго сценах перад Усяленскім Патрыярхам, мітрапалітамі і епіскапамі.

Дырэкцыя «Славянскага базару» шукае новыя зоркі. Сваім меркаваннем усе жадаючыя могуць падзяліцца ў сацыяльных сетках форуму, паведамляе дырэкцыя фестывалю. Прычым у спісах прапаноў неабходна пазначаць артыстаў, якія ніколі раней не бралі ўдзел у фестывалі. «Мы цэнім кожнае меркаванне, аднак рэальнасць таксама ўносіць свае карэктывы ў плане тэхнічных магчымасцей, умяшчальнасці канцэртнай пляцоўкі і іншых фактараў. І гэта трэба ўлічваць, пакідаючы свае пажаданні», — адзначылі ў дырэкцыі карэспандэнту БелТА. Поўны спіс імён зорак арганізатары форуму абмяркоўваюць на сустрэчы з рэжысёрска-пастановачнымі групамі фестывалю. Сваім меркаваннем з арганізатарамі падзяліліся ўжо дзясяткі людзей. Акрамя прапаноў запрасіць заходніх зорак сусветнай велічыні, названы шмат імёнаў расійскіх і ўкраінскіх артыстаў і груп.

Сёлета спаўняецца 50 гадоў з моманту выхаду на экраны адразу некалькіх значных для расійскай мультыплікацыі анімацыйных фільмаў, у ліку якіх — «Кракадзіл Гена», «Ну, пачакай!», «Віні-Пух», «Брэменскія музыкі» і «Умка», распавядае РІА «Новости». А ў снежні чакаецца фінальная частка трылогіі пра Умку. Працяг мультфільма аб белым медзведзяняці выйдзе праз 50 гадоў пасля прэм'еры першай часткі, паведамляе прэс-служба студыі «Союзмультфильм». Другі мультфільм «Умка шукае сябра» выйшаў у 1970-м, але тады мы ўбачылі толькі тое, як герой ляціць на пошукі сябра. І вось цяпер можна нарэшце даведацца, ці атрымалася ў самага кранальнага, шчырага і адважнага палярнага мішкі знайсці свайго таварыша. Гэта будзе выдатным падарункам многім пакаленням гледачоў на Новы год, упэўнены ў «Союзмультфильме». Генеральным спонсарам мультфільма выступіла кампанія «Роснефть», праект таксама падтрымала Міністэрства культуры Расіі.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

Мікола МАЛЯЎКА:

«Мінуў час клічнікаў, шукаем адказы на галоўныя пытанні»

Мікола Маляўка — пісьменнік шматжанравы. Яму падуладныя і цудоўная дзіцячая проза, і ўдумлівая паэзія, у многіх выпадках настолькі лірычная, светлая і пазітыўная, што пры знаёмстве з творцам узнікае сур'ёзны дысананс. Гэта чалавек з даволі крытычным поглядам на рэчаіснасць і асаблівым паэтычным адчуваннем свету, схільны да рэфлексіі і філасофскіх роздумаў. Да вашай увагі — аповеды, развагі і надзеі пераможцы сёлетняй Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Лепшы твор (зборнік) паэзіі» Міколы Маляўкі.

Фота з асабістага архіва Міколы Маляўкі.

Роднае карэнне

— Зямля над Нёманам, вёска Мікалаеўшчына — той куточак у вялікім свеце, дзе для мяне ўсё самае блізкае, самае запаветнае. Кожны год вяртаюся сюды з гарадскога выраю — сустрэцца з землякамі і на вясковай вуліцы, і на могілках, дзе адпачываюць яны ад клопатаў і трывог зямнога жыцця, якое скрозь складаецца з дарог. А дарогі — самыя розныя: малыя і вялікія, прамыя і звілістыя. У рэальным свеце і ў думках, успамінах. Самая лёгкая дарога — у памяць, да бацькоўскага парога. Там першы крок. Там першы ўрок. Там першае каханне. Бацькі, настаўнікі, сябры — усе маладыя, поўныя сіл і надзей на лепшую долю. Там да цябе, наіўна-бесклапотнага, не дайшоў яшчэ глыбінны сэнс народнай мудрасці: «Каб маладосць — ведала, каб старасць — магла».

Не бачыў я ў дзяцінстве, калі адпачывала маці. Засынаў — яна нешта шыла ці вязала, прала кудзелю, садзілася за кросны. Прачынаўся — яна завіхалася каля печы, даіла карову, горбілася на градах. Памёр бацька, і мы яе, старэнькую, забіралі на зіму ў горад. Яна і там не сядзела без работы: вязала шкарпэткі для нас, кофтачку для ўнучкі. А калі не магла ўжо трымаць пруткі ў руках, «палола» дыван на падлозе: тузала-вырывала з яго варсінкі, як пустазелле на градцы. Дзякуючы маме за зямныя ўрокі, можна і ўсміхнуцца — падзякаваць і за крапіву. Суседка аднойчы сказала, што я, малы, не ўмеючы плаваць, лезу з большымі хлопцамі на глыбокае месца. Мама прыбегла на бераг Нёмана і гнала мяне, голенькага, да самай хаты пучком крапівы. Ах, як жа цяпер прыемна стрыкаецца тая крапіва!..

Такімі ж працавітымі, клапатлівымі, светлымі, як маці, былі і астатнія жанчыны. Паварушу памяць — і бачу іх на вясковай вуліцы, на лавачцы, чую іх галасы, смех. «Я кульгавая, ты сляпая, яна глухая. Каб сабраў з нас адну, добрая баба яшчэ была б!..» Дзве смяюцца, трэцяя не чуе, але і яна ўсміхаецца, гледзячы на суседак… Землякі не сышлі ў вечнасць бясследна: радуюцца, плачуць, жартуюць у маіх кнігах.

Школа сталення

— Вайны я не памятаю: нарадзіўся ў 1941 годзе. Святочныя салюты ў Дзень Перамогі высвечваюць тое, што адклалася ў памяці пазней. Можна сказаць, вайну я перажыў пасля вайны — у цяжкія, галодныя і халодныя дзіцячыя гады. Да мяне нарадзілася сястрычка. Маці з ёй, маленькай, хавалася дзе папала, яна захварэла і памерла. Нават не ведаю, дзе яе магілка, каб кветкі прынесці. Ад вайны мы і цяпер не адышлі: водгулле тых далёкіх падзей — у многіх маіх творах. Пра іх многа сказана, але варта адкрываць новыя старонкі, якім раней не надавалася належнай увагі.

Яшчэ ў школе я пачаў друкавацца ў піянерскіх газетах. Стаў адным з пераможцаў паэтычнага конкурсу, які аб'явіла газета «Калгасная праўда». За прэміяльныя грошы паехаў у Карэлію — услед за рамантыкаю. Там, на лесапавале, іншымі вачыма глянуў на свет і на людзей вакол сябе, скупых на ўсмешку, строгіх. Нялёгкая праца, суровая проза будняў на нейкі час прызямлілі думкі і пачуцці, прымарозілі сцюжаю, зацьмілі бытам. Пазней на радзіме душа адтала — і мінулае ажыло ў першым паэтычным зборніку «Едуць маразы». Ажыло яскрава, у канкрэтных вобразах і карцінах, з рамантычнай падсветкаю. Карэлія стала для мяне школай сталення і гартавання, навучыла трымаць удар у складаных абставінах, гаварыць праўду ў вочы. У студэнцкую аўдыторыю я прыйшоў з атэстатам сталасці — і адметным стажам у працоўнай кніжцы.

З удзячнасцю прыгадваю сваіх настаўнікаў. Так, Юлія Сяргееўна Тупяневіч, настаўніца рускай мовы і літаратуры, «друкавала» мае вершы ў насценнай газеце, падтрымлівала пісьмамі і пасля школы, калі я нудзіўся ў Карэліі, прысылала беларускія часопісы…

Якуб Колас таксама наш настаўнік. Я вучыўся ў школе, якая носіць яго імя, вырас на яго кнігах. Ёсць, дарэчы, смяшынка. У вёсцы я жыву на вуліцы Якуба Коласа. На рагу лецішча — невялікі, без аніводнай хаты, завулачак. Дык сябры-паэты назвалі яго маім імем. І пацешна, і ўсцешна хоць так прытуліцца бокам да славутага земляка.

Каб кніга не маркоцілася на паліцы

— Цяпер у мяне багатая хатняя бібліятэка. Ды ніколі не забуду, як набыў сваю першую кніжку. У пасляваеннай вёсцы кожная капейка была на ўліку. Я дапамагаў маці збіраць грыбы і ягады: яна сушыла іх і пасля прадавала на рынку. Сабраў жменьку капеек, адшкадаваных мне на кіно, і пайшоў у Стоўбцы, дзе была кнігарня. Па дарозе баяўся згубіць грошы. І калі нарэшце раскрыў кулачок у кнігарні, прадаўшчыца ўсміхнулася: капейкі былі мокрыя — спацелі ў жменьцы. Выбралі разам аповесць-казку Аляксея Талстога «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна». У кнігарню ішоў я раніцаю — гадзіны дзве, а вярнуўся ў вёску толькі вечарам. Звярну з лясной дарогі, сяду пад хвойку — і чытаю, чытаю… Кніжка не маркоцілася дома, пайшла па руках, згубілася недзе ў занёманскай вёсцы.

Вось як шанавалася кніга! А ў наш час бібліятэкі і кнігарні закрываюцца: няма чытачоў — няма і пакупнікоў. Свае кнігі я дару сябрам, землякам, тым людзям, якія прыходзяць на творчыя сустрэчы. Час ад часу перабіраю і хатнія кнігі, шукаю тое, што ўжо чытана-перачытана, каб аддаць у бібліятэку. Здараецца, адмаўляюцца: не можам узяць — маленькі пакойчык. На жаль, многія цяпер думаюць не галавою, а жыватом. А дзеці ўжо не дабрэюць душою сам-насам з кнігаю, а жывуць у віртуальным свеце. І я паўтараю як замову: родная кніга, Божай малітваю і мастацкім словам вярніся ў рэальны свет бацькоў і дзяцей. Сітуацыя жахлівая: многія не ведаюць значэння самых простых беларускіх слоў. «Жывём вось так, нібыта за мяжою: у Беларусі — з моваю чужою».

Працуючы ў часопісе «Вясёлка», часта выступаў у школах, бібліятэках, музеях. Здзіўляўся на першым часе, калі незнаёмыя дзеці віталіся са мной на вуліцы. Спыніў неяк дзяўчынку, спытаў, адкуль яна мяне ведае. Дзяўчынка адказала: «А вы былі ў нашай школе, чыталі казку "Як зайцы з тушканчыкамі ў футбол гулялі"». І адарыла ўсмешкаю, як падзякавала.

Пры яркім святле бліскавіцы

— Жыццё мяняецца, як надвор'е: то радуе, то засмучае. Калі бывае цяжка, задыхаюся ад гарадскога смогу, шуму і тлуму, выязджаю на ўлонне прыроды. Яна і лекар, і мастак, і музыка — у адной асобе. Поры года зачароўваюць вясёлкаю і начнымі зарніцамі, красою жытнёвых палёў і грыбных баравін, галасамі птушак, музыкаю ветру, дажджу і снегападу. Згадваеш, скажам, у музейнай Альбуці радкі з «Новай зямлі» Якуба Коласа — і вось яны, перад вачыма, не кніжныя, а жывыя ілюстрацыі да паэмы. Не заўважаеш, як сам заходзіш у той далёкі свет, сустракаешся з любімымі героямі: яны цябе не ведаюць, а ты называеш іх па імені, як родных. Душа настройваецца на адну пачуццёвую хвалю з душою прыроды — і на нейкі час забываецца ўсё благое ў жыцці. Пэўна, ад прыроды ў мяне, паэта, і любоў да зямлі, і ціхі роздум, і лірычная спавядальнасць.

Я люблю навальніцы, не палохаюся грому. Кожны раз, калі ўспыхвае бліскавіца, здаецца, што нехта ў небе шчоўкае бліцам: фатаграфуе зямлю і нас, людзей. І там, на споведзі перад Богам, не прыкінешся святым, нічога не ўтоіш: здымкі — сведкі твайго зямнога лёсу. Кнігу сатырычных і гумарыстычных твораў я так і назваў — «Нябесны фатограф». Рэальны свет з мірнай цішынёю і грымотамі жыццёвых навальніц робіць болей разнастайнымі, адметнымі тэмы і вобразы з фальклорных крыніц.

Чалавека, які не памятае свайго мінулага, называюць манкуртам. Яму ўсё адно, дзе жыць, на якой зямлі і пад якім небам, на якой мове размаўляць — матчынай ці чужой. Ён не жыве, а існуе, як робат, як скульптура, выразаная з дрэва. Тыя ж птушкі кожны год вяртаюцца з выраю на радзіму. Яшчэ болей шаную я крылатых землячкоў, якія і зімою, у люты мароз, застаюцца з намі.

Пры яркім святле бліскавіцы відаць усё навокал. А пры святле ўспамінаў, пры святле малітвы ў душы бачна і тое, што засталося ў мінулым, і ясніцца шлях у будучыню. У кнізе «Спадчына, або Каб не стаць манкуртам» я расказываю пра лёс нашых продкаў, пра тое, якую спадчыну пакінулі яны нам, сваім нашчадкам. Што страцілі мы з гэтай спадчыны? Што прыдбалі за свой век? Уздыхаць па старых рэчах, вяртацца да старога ладу жыцця не варта. Але ведаць, як жылі нашы бацькі, нашы дзяды-прадзеды трэба. Каб не рвалася па-жывому крэўная сувязь пакаленняў, каб каранілася, галінілася, вечна зелянела радаводнае дрэва кожнай сям'і.

Жыццё як споведзь

— Памятаю, калі выйшла мая кніга санетаў «Старая зямля», я паставіў яе на покуць і памаліўся — за сябе і за тых людзей, якія жывуць на яе старонках. Яе, кнігу лёсу роднай вёскі, я выдаў за свае грошы, невялікім тыражом. Яна хутка разышлася. І я ўдзячны «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі»: мой паэтычны зборнік, дапоўнены новымі санетамі, перавыдалі ў серыі «Кніжная паліца школьніка». Друкуюцца санеты і ў калектыўных зборніках. Адгукнуцца б прыязнай рэцэнзіяй, а нейкі карэспандэнт папракнуў у адной з газет: не тым аўтарам спрыяюць. І пералічыў сваіх кандыдатаў на прапіску ў выдавецкіх планах. Бог яму суддзя!

Не забываецца, з якой увагаю ставіліся некалі да нас, маладых, старэйшыя творцы. У маіх кнігах шмат прысвячэнняў: нашым класікам, маім сябрам — паэтам і празаікам, родным і блізкім, проста добрым людзям. У пэўным сэнсе яны дакументальна-мастацкія, мае паэтычныя кнігі.

Падзеі ў кнізе «Сланечнік», адзначанай сёлета Нацыянальнай літаратурнай прэміяй, так ці іначай звязаны з лёсам лірычнага героя. Роздум над пражытым і перажытым хвалюе, радуе і засмучае: не ўсе задумы і мары, акрыленыя небам, збыліся на зямлі. Жыццё выпрабоўвала на трываласць і ў дзяцінстве, і ў юнацтве, і ў сталыя гады. Трывожныя думкі і цяпер, у новым веку, захмарваюць блакіт у сонечны дзень, адпрэчваюць сон.

Кожны год саджу я на сваім агародзе сланечнікі. Гэта — мой творчы абярэг. Паэтычны вобраз сланечніка, узнятага над бытам, асвятляе і асвячае, як зямное сонца, старонкі кнігі, на якіх апеты дар жыцця, дар міру, дар працы, дар сяброўства і кахання. Лёс чалавека — у лёсе краіны. Вялікая Айчынная вайна, апошнія сталінскія гады, хрушчоўская адліга, брэжнеўскі застой, гарбачоўская перабудова. Прарыў у космас і чарнобыльская трагедыя. Развал Савецкага Саюза… Мінуў час клічнікаў. Шукаем адказы на галоўныя пытанні. Куды ідзём? Што будуем замест камунізму? Які лёс чакае нашых нашчадкаў?.. Пытанні, пытанні… А час бяжыць, і трэба ім даражыць, пакуль жывём.

Чалавечы век падобны на квадры месяца: маладзік — маладосць, поўня — сталасць, ветах — старасць. Пра гэта думаю цяпер, працуючы над кнігаю «Слухаю дождж». У назве можна адчуць пэўную пераклічку са зборнікам «Едуць маразы»: там быў маладзік, тут — веташок у маім лёсе, у жыцці лірычнага героя. Болей адказнасці за кожную справу і слова: кніга твая, можа, апошняя споведзь перад сучаснікамі тут, на зямлі. «Намольваю думкі і словы, / У Бога прашу, каб і новы мой дзень, / Сыходзячы ў цень вечаровы, / Нашчадкам пакінуў світальны прамень».

Запісала Яўгенія ШЫЦЬКА

Валерый КВАРАЦХЕЛІЯ:

«Настолькі грандыёзнай “Тбілісобы”, як у Мінску, няма нават у Тбілісі»

Беларусь і Грузія — краіны з цікавай і яркай гісторыяй, у якіх, з аднаго боку, можа, і не так шмат агульнага, але ж з іншага — шмат павагі адна да адной. Краіны-сяброўкі ўжо 25 гадоў імкнуцца максімальна разгарнуць шматвектарны патэнцыял супрацоўніцтва, і на гэтым шляху неаднаразова сутыкаліся са складанасцямі, але яны яшчэ лепш дапамагалі зразумець: мы крочым у адным напрамку.

Зараз у Мінску актыўна дзейнічае Пасольства Грузіі ў Беларусі. Гэта заўважна па шматлікіх беларуска-грузінскіх мерапрыемствах. Толькі на мінулым тыдні адбыўся шэраг сумесных праектаў, адным з якіх стала маштабнае адкрыццё выстаўкі «Пад небам Грузіі і Беларусі» ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Мастакі дзвюх краін аб’ядналіся, каб падтрымаць дыпламатычныя стасункі Беларусі і Грузіі. На адкрыцці выстаўкі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў Беларусі Валерый Кварацхелія адзначыў, што сумеснае развіццё дапамагае шукаць і знаходзіць агульную мову, пазбягаць непаразуменняў.

Выстаўка «Пад небам Грузіі і Беларусі» стала добрай нагодай для размовы з паслом Грузіі наконт развіцця рознабаковых культурных стасункаў і магчымасцяў больш глыбокага вывучэння нацыянальных рыс абедзвюх краін.

— Спадар пасол, Беларусь — краіна, якая дзесяцігоддзі выбудоўвае сяброўскія адносіны з многімі дзяржавамі. Грузія не выключэнне. Як вы ацэньваеце нашы двухбаковыя кантакты? Наколькі максімальна сёння Пасольства Грузіі ў Беларусі рэалізоўвае свой патэнцыял на нашай зямлі?

— За мінулы тыдзень у Мінску прайшло шмат грузінска-беларускіх мерапрыемстваў. Выстаўка «Пад небам Грузіі і Беларусі» стала яркай падзеяй. Вядома, мы хочам, каб палітыка была ўбаку ад культуры, эканомікі і спорту, але яна ўсё ж уплывае, і часам у гэтым адчуваецца пэўная карысць. Як у выпадку развіцця стасункаў Беларусі і Грузіі.

Сёння, на шчасце, паміж нашымі краінамі выдатныя адносіны. Мы ўзаемадзейнічаем па любых пытаннях. І гэта адразу ж адбіваецца на культурным супрацоўніцтве. У нас прайшла выстаўка ў галерэі імя Міхаіла Савіцкага «Грузія — краіна старажытнай культуры». Гэта вельмі цікавы праект, які выклікаў рэзананс у беларускай грамадскасці. Мы пастараліся дапамагчы дзіцячым дамам, перадалі ім квіткі, каб выстаўку наведалі таксама маленькія госці. Такім чынам хацелі паказаць патэнцыял Грузіі як краіны, якая цяпер адна з вядучых у свеце па турызме. Уявіце толькі: наша краіна налічвае 3,5 мільёна насельніцтва, а мы кожны год прымаем 8 мільёнаў турыстаў. Гэта вельмі добры паказчык. А пасля выставак, якія мы арганізоўваем у Беларусі, бачым, як беларусы загараюцца і таксама хочуць убачыць прыгажосць Грузіі, бо гэта краіна не толькі мора, але і прыгожай незабыўнай культуры. Раней беларусы прыязджалі толькі ў Тбілісі ці Батумі, цяпер з’яўляецца шмат іншых месцаў, якія раскрываюць наш патэнцыял больш шырока.

Нядаўна ў Мінску мы правялі вечар памяці выдатнага кампазітара Гія Канчэлі, які памёр месяц таму. Велізарную падзяку хочацца выказаць беларускай філармоніі і ансамблю «Класік-Авангард», якія зладзілі ўнікальны вечар. Я атрымаў велізарнае задавальненне, думаю, іншыя гледачы таксама. Гэтым мы яшчэ раз даказалі: у Грузіі ёсць цікавыя кампазітары.

На дадзены момант у Беларусі гастралююць два грузінскія тэатры. Гэта вельмі цікавы Тэатр руху і Тэатр кінаакцёра імя Міхаіла Туманішвілі, які пакажа спектаклі ў Мінску і Гомелі. Нядаўна пабываў у вашай краіне Кутаіскі дзяржаўны драматычны тэатр імя Ладо Месхішвілі. А ў рамках форуму «Тэарт» паказалі ўнікальны спектакль «Сталінград» Тэатра Рэза Габрыядзэ з Тбілісі. Гэты спекакль аб’ездзіў увесь свет. І ўсюды яго прымалі выдатна. Дарэчы, беларускія тэатры таксама ў хуткім часе адправяцца ў Тбілісі.

Выстаўка «Пад небам Грузіі і Беларусі» стала завяршэннем яркіх падзей лістапада. Грузінскія мастакі, якія жывуць тут (грузіны па паходжанні), з задавальненнем згадзіліся ўзяць у ёй удзел. Мне было цікава паглядзець на беларускіх мастакоў. Заўважна, што галерэя «Універсітэт культуры» шмат папрацавала. Мы адабралі менавіта тых аўтараў, якія неяк звязаны з Грузіяй.

На гэтым год беларуска-грузінскіх культурных адносін не заканчваецца. 6 снежня чакаецца неверагодная падзея: легендарныя Нані Брэгвадзэ і Вахтанг Кікабідзэ выступяць у Мінску з канцэртам. Іх ніхто не мог аб’яднаць з 1960-х гадоў. Калісьці яны разам пачыналі музычны шлях, а сёння паспяховыя кожны сам па сабе, але вырашылі на некалькі гадзін вярнуцца ў эпоху, калі маладосць бурліла ў крыві, ды, мне здаецца, яна ў іх бурліць і сёння.

Мяркую, што наступны год будзе таксама насычаны сумеснымі культурнымі мерапрыемствамі, бо мы ўжо многае напланавалі. Сіл хапае, магчымасцяў — таксама, таму што дапамагаюць нашы спонсары і беларускія калегі. Для чаго мы наогул усё гэта робім? Хочам, каб беларускі народ добра ведаў Грузію, а грузіны — беларусаў.

Скажу прама: Беларусь і Грузія цяпер знаходзяцца ў такіх адносінах, якіх не было, нават калі мы існавалі ў межах адной краіны. Якраз гэты факт мне як паслу дае магчымасць на любы вектар адносін глядзець больш маштабна: не толькі праз прызму аднаго спектакля, канцэрта або выстаўкі, а якраз праз шэраг падзей. Безумоўна, гэтыя мерапрыемствы патрабуюць падрыхтоўкі, канцэпцыі і ўвагі. Але мы бачым аддачу і хочам гэтым займацца. Ужо прызначаны дзень (20 ліпеня), калі ў наступным годзе пройдзе «Тбілісоба». Пачалі рыхтаваць гэтае свята, маштабнае і прыгожае.

Усе намаганні нашага пасольства накіраваны на стварэнне сяброўскай атмасферы. Калісьці Беларусь падтрымала Грузію, калі нам было цяжка, — для нас гэта важна. Менавіта таму я ўпэўнены, што магу адказаць на ваша пытанне сцвярджальна: мы працуем з максімальнай аддачай.

— Вы ўжо згадалі «Тбілісобу». Гэта сапраўды грандыёзнае і прыгожае нацыянальнае свята. У сувязі з гэтым хацелася б даведацца, ці праводзяцца падобныя мерапрыемствы беларускай культуры ў Грузіі?

— Няма, але ніхто гэтага не забараняе. Пры жаданні беларускіх сяброў, беларускага пасольства ў нас можна зрабіць такое ж мерапрыемства. У мінулым годзе былі Дні культуры Беларусі ў Грузіі. Прайшлі вельмі насычана. Беларускія прадстаўнікі бяруць удзел у «Тбілісобе», якая ладзіцца ў Тбілісі. Яны там актыўна прадстаўлены, у іх ёсць свой стэнд, дзе можна шмат чаго даведацца пра розныя аспекты беларускай культуры.

Прызнаюся, што настолькі грандыёзнай «Тбілісобы», як у Мінску, няма нават у Тбілісі. Гэта ўжо традыцыя. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вельмі падтрымлівае нас. Гэта важна. Дзякуючы яго падтрымцы ў арганізацыі нашых мерапрыемстваў мы не сутыкаемся з перашкодамі.

Калі з’явіцца жаданне Дзень Мінска або Беларусі зрабіць у Тбілісі, я дакладна ведаю, што ніякіх пярэчанняў не будзе. Пакуль наш бок такіх прапаноў не чуў. Калі ж мы ўбачым цікавасць, я абавязкова дапамагу. Мэр Тбілісі, які кожны год бывае ў Мінску, таксама падтрымае.

— А ў цэлым культура Беларусі ў Грузіі вядомая? Беларускі бок грузінскую культуру вельмі любіць. Ці ёсць у вашага народа цікавасць да нашай нацыянальнай культуры?

— Нядаўна Беларусь і Грузія адзначалі 25-годдзе нашых дыпламатычных адносін. Здаецца, для гісторыі чвэрць стагоддзя — адрэзак часу маленькі, але за гэты тэрмін мы зрабілі многае. Калі разбурыўся Савецкі Саюз, ніякіх стасункаў не было, усе разышліся...

Імпульс развіццю нашага збліжэння даў візіт у Грузію Аляксандра Лукашэнкі. Ён прыехаў упершыню да нас у Тбілісі, зрабіў вельмі важную для нашага народа заяву. І тады было прынята рашэнне аб стварэнні Пасольства Беларусі ў Грузіі. Менавіта гэтае рашэнне запусціла ўсе працэсы нашай агульнай інтэграцыі. Сёння Грузія вельмі зацікаўлена ў паглыбленні ведаў пра беларускую культуру.

Зусім нядаўна ў нас прайшла выстаўка знакамітага беларускага скульптара Андрэя Асташова. Мне здаецца, яе наведалі ўсе, хто хоць нешта разумее ў мастацтве. Гэтую падзею запомнілі. Хачу, каб у наступным годзе выстаўка скульптара зноў прайшла ў Грузіі. Міністэрствы культуры Грузіі і Беларусі заключылі мемарандум, па якім раз на тры гады дні культуры павінны арганізоўвацца ў нашых краінах. У наступным годзе надыдзе чарга беларусаў прыехаць у Тбілісі і расказаць пра сябе.

Вядома, усё адразу ахапіць немагчыма. Але важна, што мы ўмеем дамаўляцца. Трэба адзначыць, што кансерваторыі Мінска і Тбілісі таксама супрацоўнічаюць. У нас ёсць Фестываль царкоўных спеваў. І музыканты, прафесары, спевакі абменьваюцца досведам у гэтым кірунку. Гэта таксама факт культурных зносін і абмену.

— У кантэксце культуры мы з вамі гаварылі пра мастацтва, тэатр, музыку. А як справы з літаратурнымі кантактамі?

— Актуальнае, дарэчы, пытанне. Я ўжо казаў, што зараз у Мінску знаходзіцца Тэатр кінаакцёра імя Міхаіла Туманішвілі. Загадзя ў вашу сталіцу прыехала яго вядучая актрыса Нінэль Чанкветадзэ. Яна з’яўляецца членам журы фестывалю «Тэатральны куфар». Нядаўна мы з ёй размаўлялі, і яна сказала, што вельмі шмат добрых п’ес пішуць беларускія драматургі. У Грузіі ў гэтым кірунку мы адстаём. Вядома, мы стараемся адраджаць традыцыі, але гэта складана.

Нінэль, знаходзячыся ў Мінску, зрабіла невялікі інтэрактыў: маладыя акцёры расказвалі ёй сваімі словамі сцэнарыі беларускіх аўтараў. Яе гэта вельмі зачапіла. Некалькі сцэнарыяў яна ўзяла на заметку з мэтай паставіць па іх спектаклі ў Тбілісі.

Але раней Пасольства Грузіі ў Беларусі ў літаратурным напрамку працавала мала. Тут таксама патрэбныя людзі, якія б прыйшлі і сказалі: «Гэта трэба рабіць».

Я сустракаўся з вядомымі сцэнарыстамі і кінарэжысёрамі Беларусі. Была ідэя зрабіць добры сумесны праект — беларуска-грузінскі фільм пра стасункі Грузіі і Беларусі. Бо нас шмат чаго звязвае, асабліва вайна, у якой пацярпелі абодва народы. Я ведаю, што многія грузінскія афіцэры і салдаты ваявалі на беларускай зямлі. Мне вельмі прыемна, калі я бачу, як у вашай краіне ўшаноўваюць іх памяць. Вяртаючыся дадому, заўсёды расказваю, як у Беларусі ўмеюць цаніць подзвігі, дружбу, як умеюць разумець з паўслова.

Мы можам пачынаць рухацца ў напрамку развіцця літаратурных кантактаў, бо тэатры нашы, напрыклад, таксама супрацоўнічалі не заўсёды. Можа быць, нават не трэба чакаць выпадку, каб пачаць дзейнічаць, а проста шукаць самім агульныя вехі сучаснасці і гісторыі, якія дазволяць быць на крок наперадзе. Асабіста я адкрыты для ўсіх. Не трэба да мяне запісвацца, не трэба чакаць сто дзён сустрэчы. Я магу з усімі сустрэцца, для таго і знаходжуся ў вашай краіне, каб актыўна супрацоўнічаць і развіваць наш патэнцыял.

— Яшчэ адзін напрамак, які варта абмеркаваць, — двухбаковыя турыстычныя маршруты, якія дазволяць паглыбіць вывучэнне нашых культур. Ці ёсць ідэі развіцця абменных кірункаў?

— Ідэі ў мяне ёсць. Беларусь пакрысе адкрываецца для грузінскіх турыстаў, асабліва для паляўнічых. Многія з тых, хто пачаў сюды прыязджаць, вельмі ўразіліся.

Пакуль Грузія кожны год праводзіць інфармацыйныя туры асобна для журналістаў і тураператараў. Ужо 2 снежня ад тураператараў 12 чалавек паляцяць у Грузію. За 10 дзён ім пакажуць тыя месцы, якія малавядомыя нават нашаму народу. Калі вернуцца, будуць ведаць, што прапаноўваць людзям, якім каларытам зацікавіць. Мне здаецца, беларускі бок павінен рабіць тое ж самае, запрасіўшы сюды грузінскіх тураператараў і журналістаў. Гэта дазволіць вам прадэманстраваць свае магчымасці.

Магу сказаць шчыра, у Грузіі патэнцыял Беларусі як турыстычнай краіны ведаюць мала. Але я бачу, што гэтую сітуацыю можна змяніць. У вашай краіне шмат унікальных месцаў, вартых увагі. Проста пра іх ведаюць мала. Наша пасольства знаходзіцца ў Верхнім горадзе. Калі я гляджу ў акно, бачу, што з кожным годам турыстаў у Беларусь прыязджае ўсё больш, і вельмі хацелася б, каб сярод іх былі грузіны.

У нашым пасольстве працуюць зацікаўленыя людзі. Калі аб’яднаем намаганні з беларускім бокам, атрымаецца магутны тандэм.

— Мы пачалі з вамі размову з думкі, што досыць часта галоўныя вектары развіцця дзяржавы ўплываюць на культуру. Ці перашкаджала гэта калі-небудзь дзейнасці Пасольства Грузіі ў Мінску?

— Мы заўсёды былі настроены на працу, таму перашкоды калі і могуць быць, то ў нас у галаве. Паколькі кожны год мы прыступка за прыступкай даказваем усяму свету, што Беларусь і Грузія — сябры не на словах, а на справе, то маем права ганарыцца сваёй дзейнасцю.

Я ўпэўнены, што мы зможам яшчэ глыбей зразумець і спазнаць характар нашых культур, адчуць усе важныя моманты. Сёння я настроены на поспех ва ўсіх аспектах узаемадзеяння. Як паказвае досвед і практыка, Беларусь ніколі нас не падводзіла ў стратэгічных планах, як і мы яе. Пакуль нам важна працаваць і прыцягваць да гэтай працы ўсіх неабыякавых.

Вікторыя АСКЕРА

Цымбалы дажджу на трубах вадасцёку

Паэзія, прадстаўленая на старонках лістападаўскага «Полымя», разнапланавая. У ёй адлюстравалася імкненне спасцігнуць сутнасныя асновы духоўнасці (падборка «Радасць і мальба» Васіля Жуковіча), асэнсаванне сутнасці прыроды чалавека са спробай зазірнуць у недалёкую будучыню (нізка Алы Клемянок «Я іду да сябе»), разуменне сябе ў гэтым свеце як драбнюткай часцінкі чагосьці магутнага, вечнага (Міхал Бараноўскі з вершамі пад агульнай назвай «Люстэрка»).



Упаляваць драпежнага звера і скарыць космас — нішто ў параўнанні з больш складанай задачай — перамагчы свой цёмны бок, упэўнены Васіль Жуковіч. Паэт дае надзею чытачу: усё магчыма, калі ёсць вера. Не варта вынаходзіць рэцэптаў поспеху, калі ўсведамляеш: галоўнае — «...трыадзінства, / Вера, надзея, любоў» — лейтматыў вершаў, прадстаўленых да ўвагі чытача. Яму і вырашаць, наколькі па-мастацку яны прамоўлены...

Штучны інтэлект, матрыца, расшыфраваны геном чалавецтва — праблемы, якія хвалююць паэтэсу Алу Клемянок. Нельга сказаць, што вершы напоўнены аптымізмам, хутчэй, яны азмрочаны адчуваннем неспакою за жыццё на зямлі. Чалавеку складана знайсці паразуменне з самім сабой, а таксама з сабе падобным. Дзе гарантыя, што высокі ўзровень яго дасягненняў у навуковай сферы паслужыць не на шкоду гэтай маленькай у касмічных маштабах безабароннай планеце? Аўтарка засяроджваецца і на ўнутраных адчуваннях, абмежаваных сценамі яе мікракосмасу: створаная карцінка нагадвае графічны малюнак, лаканічны і самадастатковы:

Цымбалы летняга дажджу
Гучаць на трубах вадасцёку...

Міхал Бараноўскі праз творчасць будуе мост як нешта лагічнае, што структуруе прастору лірычнага героя, як тое, што злучае два сусветы: бязмежнасць мінуўшчыны (да якой нельга фізічна дакрануцца) і абмежаванасць кожнага канкрэтнага імгнення тут-і-зараз (якія не выпускаюць з абдымкаў)... Але вось парадокс: гэтыя два сусветы перацякаюць адзін у другі незалежна ад намаганняў аўтара. Бо тое, што будзе, — як парастак, які паказваецца з глебы таго, што было... Вельмі імпануюць арыгінальная вобразнасць і іронія аўтара:

Вялікая артылерыйская гільза ў калоду загнаная:
Калісь пэўна хораша гвазданулі з гаўбіцы
А зараз сусед прыладзіў яе пад кавадла
І раўняе цвікі
Б'е малатком па стальным азадку
І пытаецца
Ці будзеш у людзей больш страляць
Ці будзеш

Прозу прадстаўляюць Вітаўт Чаропка завяршэннем рамана «Паўшыя анёлы», Алесь Аляшкевіч — аповесцю «Белая дама» і Уладзімір Сіўчыкаў — невялікімі гісторыямі, тэматычна аб'яднанымі пад агульнай назвай «Мастак і мадэлі. З нізкі "Уладзевы гісторыі"».

Сюжэт аповесці пабудаваны ў традыцыях жанру містычнага дэтэктыву (але «містыкай» аказваецца прадуманы ход злачынцы). Паданне, вакол якога раскручваецца дзеянне, узята з гісторыі. Ёсць і любоўная лінія. Галоўны герой — следчы, які прыязджае ў вёску разблытаць знікненне людзей, гераіня — чароўная варшавянка, якая цікавіцца гістарычнай спадчынай. Па законах жанру злачынцам мусіла быць менавіта гэтая дзяўчына анёльскай знешнасці, але ж да канца расповеду яна застаецца «анёлам»... Улічваючы, як шмат і якімі аўтарамі створана ў гэтай галіне, ад таго новага, што выходзіць з-пад пісьменніцкага пяра, чакаеш чагосьці надзвычайнага, вострасюжэтнага, прамоўленага хаця б у нечым па-іншаму і... у фінале застаешся «галодным».

Героямі У. Сіўчыкава сталі яго знаёмыя з творчага асяродку. Ён распавядае, што наваражыла Уладзіміру Караткевічу цыганка Аза, нашто Пятро Васючэнка хаваў кубкі з кавай дый іншыя кур'ёзныя здарэнні.

Адкрыццём нумара стала публікацыя ў рубрыцы «Спадчына». Ганна Севярынец змясціла жыццёвую гісторыю паэтэсы Наталлі Вішнеўскай і тры яе невядомыя раней вершы, што захоўваў у прыватным архіве Алесь Звонак.

Яна БУДОВІЧ

Знайсці час для цяпла

У лістападаўскім нумары «Нёмана» надрукаваны ўрывак з рамана Уладзіміра Ліпскага «Марына» пра падарожжа Марыны Мнішак у Маскву да Дзмітрыя (пераклад Міхаіла Кенькі). Перад чытачом — набожная (з душы яе раз-пораз льецца малітва), клапатлівая (лічыць, што ўсім трэба парадніцца, а спярша царам, каралям, ваяводам), цярплівая, пужлівая, шчырая. Шэраг гэтых бясспрэчных якасцей прыўкраснай жанчыны можна працягваць бясконца. Аднак яе памкненне галоўным чынам у адным — «уз'яднацца» з Дзмітрыем, што выглядае лагічным, але, падаецца, змяншае каштоўнасць Марыны як асобы, як гераіні рамана.

Сустракаюцца, дарэчы, фразы такога кшталту: «Раніца дня 20 сакавіка 1606 года пачалася ў сем гадзін і дзевяць хвілін. Пра гэта казаў каляндар. А для Марыны Мнішак той дзень пачаўся яшчэ раней» ці «Вясновы дзень быў чысты, свежы, як і прыгажосць Марыны Мнішак. Па календары ён пачаўся ў 6 гадзін 47 хвілін. Доўжыўся 12 гадзін 53 хвіліны. Але па насычанасці падзеямі і багацці ўражанняў яго можна паставіць упоравень з вечнасцю». Вядома, проза можа быць розная, ёй неабавязкова быць ёмкай. Але ці не лепш выказаць тыя ж думкі ў больш лаканічнай форме, асабліва калі казаць пра такія дробязі, як ранні пад'ём ці насычанасць дня?



Апавяданне Андрэя Караля «Размова з маўклівым чалавекам» — той выпадак, калі цікавая мастацкая задума крыху размываецца з-за вялікай колькасці філасофскіх канцэпцый і догмаў. Гэтаму, магчыма, паспрыяла тэматыка: у творы вядуцца размовы пра такія катэгорыі, як веды і інфармацыя, маўчанне і слова, сутнасць жыцця і час. Аўтар спрабуе па-філасофску даследаваць сусвет, адказаць на істотныя пытанні. Галоўнае з іх — страта чалавекам сябе: «Чалавек, спяшаючыся, не здольны пачуць іншага чалавека і ўбачыць яго. Ён пачаў губляць сябе і іншых. Час і чалавек — узаемазвязаныя паняцці».

Больш цікавымі падаюцца апавяданні рубрыкі «Сябрына: Беларусь — Расія». У яе ўвайшлі творы пераможцаў конкурсу маладых літаратараў «Мост дружбы» (2016 і 2018 гады). Віктар Чыгір, Дзмітрый Лагуцін, Карына Пашкевіч-Ломцева, Аліна Асокіна, Кацярына Капыткова, Юлія Шурбіна, Яна Паўлава, Андрэй Кулеш, Алёна Папко, Анастасія Бакуновіч, Антон Лукін і Ігар Аўласенка — тыя імёны маладых празаікаў, што эксперыментуюць з малой формай. Разнапланавыя творы змешчаны на васьмідзесяці старонках: кожны знойдзе нешта цікавае. Так, напрыклад, чытанне рубрыкі можна пачаць з лёгкага і ненавязлівага твора Д. Лагуціна «Мая Японія», які вяртае ў дзяцінства і той свет ілюзій, у якім рана ці позна аказваецца кожны.

Падборка вершаў Галіны Дубянецкай «Анадзіямена» ў перакладзе Глеба Артханава і Георгія Кісялёва (аўтарызаваны) даволі аднародная па настроі, але кожны верш будзе ўспрымацца чытачом па-рознаму ў залежнасці ад паэтычных пераваг. Некаторыя радкі ўсё ж падаюцца сумніўнымі (зрэшты, магчыма, гэта заўвага да ўзроўню перастварэння):

…куда же кинуться куда
огонь вода
до края света хоть кричи
о помощи
…подъем крутой зачем борю?
— кричать зарю!

Нізка вершаў Валерыя Грышкаўца «Асеннія доўгія ночы» напоўнена пытаннямі. Але лірычны герой знаходзіцца не ў стане выбару і не ў стане дыялогу з кімсьці — гэта хутчэй размова з самім сабой як спроба пабачыць сябе збоку, іншымі вачыма: падводзячы вынікі, нібы напрыканцы жыцця. Таму пытанні не выходзяць за межы асабістых разваг, калі «ўсе крыўды — да сябе, і — ні просьбаў, і — ні слова папрока». Але аўтар, здаецца, крытычна настроены да сябе, бачыць надзею ў самім жыцці, спадзеючыся, што заўсёды знойдзецца час для цяпла: «Наше солнце ещё не погасло / Это — непогодь, морок, а там / Грянет утро — широко и ясно, / Станет просто душе и глазам».

Яўгенія ШЫЦЬКА

Пажоўклая вытаптанасць vs любоў да мастацтва

Лістапад у новым нумары «Маладосці» праходзіць па ўсіх канонах літаратурнага часопіса, бо ў ім разам з усёй краінай (і ў гэтым «разам» чуюцца ноткі нейкай адказнасці літаратурнага аркестра перад дырыжорам-дзяржавай) адбываюцца праводзіны апошніх подыхаў восені.

У рубрыцы «Старонка аднаго верша» верш Вольгі Нікіценкі (Івалгі) пад назвай «Восень». Цікава, з якой прычыны менавіта гэты верш апынуўся на старонках нумара. Ну, акрамя таго, што ён пра восень. А восень яшчэ такая, ведаеце, не па-восеньскі кволая: усюды «хмары», «міражы», «ссівелыя манахі», «туманы навокал, як будучы белы снег». Больш да зімы падобная. Але ж і сам лістапад — гэта ўжо хутчэй зімні месяц, чым восеньскі. У астатнім — калі думаць не пра восень, а пра аўтара — гэта, здаецца, не самы рэпрэзентатыўны верш, у якім можна па-мастацку раскрыцца перад чытачом. Можна было б зразумець, калі б восеньскі заказ з вершам пра восень адпрацоўваў тэкст нейкага мэтра. Навошта ж падаваць сябе ў сціслым фармаце такім чынам і такой маладой паэтцы — цалкам незразумела.

Першая паўнавартасная вершаваная падборка нумара — за Веранікай Герко пад назвай «Знайдзі мяне ў снежаньскім бясснежжы». Па-першае, бачна, што фраза (узятая з верша) выбіваецца з рытма праз літару «ў», якая ўжо не адзін год застаецца нязменным індыкатарам рускамоўных аўтараў, якія з той ці іншай прычыны пішуць па-беларуску. Па-другое, дзіўна, што падборка вершаў з падобнай назвай не пайшла ў наступны, снежаньскі нумар. Аднак цікава, што па сутнасці назва падборкі — падманка, бо на самай справе ўсе вершы — пра каханне. І, на шчасце, пра каханне не да бойфрэнда — да «цішыні», «лірыкі», «натхнення», да самога «кахання».

У другой падборцы паэтычных твораў усё крыху больш празаічна. І не толькі таму, што ў ёй верлібры. Тэматычна, амаль на сто адсоткаў, «Анатомія восені» Юліі Шэдзько распавядае пра восень. Ад смужнай манатоннасці ратуе толькі вобразная разнастайнасць і цікавая структура другога верша, у якой верлібрычныя радкі сумяшчаюцца з рыфмаванымі.

Пісьменніца Вольга Ропат у інфармацыі пра сябе кажа, што марыць «атрымаць зваротную сувязь, крытыку». Таму з усёй прозы «лістападнага» нумара будзе лагічна засяродзіцца менавіта на яе апавяданні з назвай «Чырвона-жоўты *glass*». Назва нездарма на дзве трэція складаецца з колераў: увесь твор наскрозь жывапісны. Гэта адлюстроўваецца як у самім аповедзе, падзеі якога адбываюцца ў майстэрні і адзін з галоўных герояў якога — персанаж карціны, так і ў яго мове: сказы вельмі шчодрыя на каляровыя эпітэты. Увесь твор пранізаны любоўю да мастацтва (пра што аўтарка гаворыць зноў жа ў інфармацыйным пазамастацкім фрэйме), ён сам складаецца з мастацтва, і гэта той самы выпадак, калі шчырасць заканамерна перацякае ў якасць. Адзіны сумніўны момант — калі аўтарка залішне «ў лоб» выступае супраць дзяўчат, якія робяць сэлфі. На фоне агульнай інфантыльнай пяшчоты гэты кавалак тэксту выглядае досыць грубым, не пасуючым твору выказваннем. Але ў астатнім атрымалася штосьці накшталт добрай маленькай каляднай прыгоды з папраўкай на пару года.

Калі дадаць да гэтага астатнюю прозу і некаторую публіцыстыку, простым вокам можна пабачыць, што нумар сам сябе абмяжоўвае тэмамі восені і малой радзімы, з-за чаго нецярплівы чытач можа незнарок прапусціць, напрыклад, твор Вольгі Ропат. А хацелася б, каб выдатныя творы менавіта вылучаліся з шэрагу іншых і на фоне адзін аднаго, а не патаналі ў знарочыстай сезоннай лістоце.

Данііл ЛЫСЕНКА

ТВОРЦА, ЯКІ ВАНДРУЕ ПА ЧАСЕ

Літаратурныя творы часта і абсалютна натуральна паўстаюць сродкамі выказвання аўтарскіх думак і разважанняў пра свет, нярэдка сюжэт будуецца вакол згоды або нязгоды з канкрэтнымі канцэпцыямі і поглядамі на жыццё. Некаторыя творы становяцца адлюстраваннем не поглядаў, а працэсу асэнсавання тых ці іншых ідэй і падзей.

Раман Вітаўта Чаропкі «Паўшыя анёлы», які выходзіў у апошніх нумарах часопіса «Полымя», паўстае своеасаблівым сінтэзам гэтых двух спосабаў адлюстравання аўтарскага меркавання ў тэксце.

Гэта гісторыя непрызнанага мастака і яго сябра, уладальніка галерэі, якія невядомым чынам трапляюць у будучыню. Там іх чакае безліч прыгод (палова іх звязана з паліцыяй), жорсткасць, каханне і магчымасць даведацца, як змянілася жыццё за семдзесят гадоў. Здавалася б, дзе ёсць гульня з часам, там дакладна можна аднесці твор да фантастыкі. Але ў гэтым выпадку фантастычны элемент нівелюецца, бо ніякай механікі пераносу персанажаў у іншы час, ні самога працэсу не адбываецца. Ёсць персанаж, якога называюць вандроўнікам па снах, і ўсё пачынаецца з таго, што ён набывае карціну галоўнага героя і плаціць за яе грашыма будучыні. Ён і паўстае прадстаўніком нейкай містычнай сілы, якая нясе адказнасць за гульні часу. Большую частку рамана героі намагаюцца яго знайсці, каб патрапіць назад, у сваю эпоху, і таксама, як і чытачы, не атрымліваюць ніякіх тлумачэнняў.

Калі час рамана дакладна акрэслены — спачатку 1939, а пасля 2009 год, — то з прасторай становіцца складана. Калі краіну дзеяння больш інтуітыўна вызначаеш як Беларусь, то з большай канкрэтыкай паўстаюць цяжкасці. Толькі-толькі патрапіўшы ў будучыню, мастакі звяртаюцца да афіцыянта «пан», які выпраўляе іх, кажучы «у нас паноў няма, усе таварышы». Дзіўна, што дыялог будуецца менавіта такім чынам, улічваючы тое, што мастакі былі савецкімі людзьмі. Можна дапусціць, што дзеянне адбываецца ў Заходняй Беларусі, але тады з'яўляецца іншае пытанне: ці напраўду людзі летам 1939 года маглі шчыра здзіўляцца і не разумець, адкуль возьмецца вялікая і страшная вайна, якую прарочыць ім вандроўнік. Улічваючы тое, што ў апісанні 1939 года нічога не выдавала нават прыкладнай даты дзеяння, можна зразумець, што прастора і час у рамане — рэчы даволі ўмоўныя, аўтар стварае калі не альтэрнатыўную рэчаіснасць, то як мінімум альтэрнатыўны ракурс.

Гэтая неканкрэтнасць разам з доўгімі, маналагічнымі, разважлівымі размовамі персанажаў стварае ўражанне, што раман варта ўспрымаць як суцэльнае філасофскае выказванне, як разважанне. Гісторыя пра «пападанцаў» паўстае вельмі зручнай оптыкай для такіх разваг, бо паказвае сучасны свет на кантрасце, праз прызму непрызвычаенасці да гэтага свету. Вядома ж, госці з мінулага ўспрымаюць усё ў 2009-м як занадта хуткае, імклівае, сумуюць з прычыны значнай змены ў выглядзе горада і гараджан: асабліва ім не падабаюцца шкляныя гмахі, якія сталі вышэйшыя за цэрквы і малыя ўтульныя пабудовы, а таксама занадта вольная манера апранацца сучасных жанчын. Хтосьці з герояў нават параўноўвае іх з «матронамі, для якіх верх непрыстойнасці — аголеная шчыкалатка». Таксама крыху анахранізм для 1939-га, але зноў жа — час і прастора ў гэтым рамане, як бы дзіўна гэта не было, адыгрываюць вялікую ролю сваёй нязначнасцю. Цэнтр твора — філасофскія пытанні, вечныя тэмы.

Апавяданне будуецца на рэзкіх кантрастах: сапраўднае непрызнанае масамі мастацтва і «прадажнае», якое пасуе да шпалераў; духоўнасць і бездухоўнасць; свабода і несвабода; шэры натоўп і ўнікальны талент; вытанчаная жаноцкасць і развязнасць. Ці ёсць месца добраму ў цэлым свеце дрэннага? Абмеркаванне гэтых паралеляў вядзецца пастаянна і, як часам здаецца, займае болей месца, чым разборкі з гопнікамі, уцёкі ад паліцыі і выпіўка.

Не трэба забывацца пра тое, што чытач хутчэй за ўсё знаёміцца са скарочанай часопіснай версіяй твора, але і пры гэтым варта адзначыць, што падзеі развіваюцца надта імкліва, аўтар уводзіць вялікую колькасць персанажаў, увесь час пашыраючы кола ўдзельнікаў і прычын для дыскусіі. Вобразы персанажаў таксама створаны «шырокімі мазкамі», некалькімі кароткімі звесткамі, далей чалавек мусіць даць азначэнне сабе сам, праз свае думкі і словы. Сюжэт увогуле паўстае даволі фрагментарным, як кінематаграфічная змена кадраў, перад вачыма праносяцца асобныя эпізоды з жыцця героя, і, хаця яны храналагічна звязаныя, усё адно застаецца адчуванне недаказанасці, быццам нейкія дэталі, якія прывялі да наступнага «эпізоду», усплываюць пазней.

Такой нечаканасцю для чытача становіцца і фінал твора. У пэўным сэнсе яго можна лічыць адкрытым, бо ў ім своеасабліва пераплятаюцца надзея і безнадзейнасць, несвабода, горыч, быццам героі трапляюць у скрыню Пандоры. Дуалізм здабытага і страчанага ў гэтай прывіднай будучыні годна завяршае шэраг філасофскіх думак і сюжэтных паваротаў.

Дар'я СМІРНОВА

Наканаванасць неўсвядомленага вагання

Калі пачынаць апошнюю кнігу Сяргея Ваганава «Я веру ў Цуд» (ПУП «Кнігазбор», 2018) не з першых старонак, а з канца, са зместу, можа падацца, што чакае істотнае і разнастайнае чытво: у кнізе шмат раздзелаў, дзве мовы, розныя жанры, прысвячэнні не толькі сябрам, але і вядомым літаратарам. Прадмова таксама прыцягвае ўвагу: аўтар параўноўваецца з шасцідзясятнікамі, а анонс апошняга раздзела суправаджаецца словамі «Вершы апошніх гадоў ці не найлепшыя ў кнізе». Усё гэта гучыць вельмі прывабна, стварае вонкавы вобраз удалай кнігі... Ці атрымліваецца гэтаму вобразу адпавядаць?

Пачынаецца першы беларускамоўны раздзел нейтральна: касмічна-снежныя матывы павольна блукаюць з верша ў верш, задаючы нейкі агульналірычны настрой. Сярод першых твораў ёсць і «тытульны», з якога паходзіць назва кнігі. Але ўражанне ад яго (ды і ад назвы) псуецца акурат у той момант, калі не спрацоўвае спроба аўтара стварыць нешта афарыстычнае. Фраза «Я веру ў Цуд, але не ў цуды» не дадае нічога кульмінацыйнага ні да зместу верша, ні да зместу ўсёй кнігі. Уся лірычная маса, бы лавіна, сыходзіць у нікуды адразу, як з'яўляецца верш памяці Барыса Нямцова. Яшчэ можна было прыкрыць вочы на тое, як створаны лірычныя творы: з мінімумам мастацкіх сродкаў, з прамой, як карабельныя мачты, падачай сэнсу, не надта выразнай мовай. Усё ж такі ў некаторых выпадках агульныя выразы, лёгкая туманнасць і абстрактна-паэтычны пафас могуць стварыць калі не пераканаўчую вобразную тканіну, то хаця б яе флёр, голы настрой. Але гэткія хітрыкі мігам сточваюць свае вострыя зубы ў той самы момант, калі ім на стол кідаюць нешта рэалістычнае і канкрэтнае (і тым больш — досыць сур'ёзнае, грамадска-сацыяльнай накіраванасці, як смерць Нямцова). Тады пачынаецца ваганне паміж двума полюсамі: пры захаванні звыклых для Сяргея Ваганава мастацкіх прыёмаў атрымліваецца нешта падобнае на школьнае сачыненне на тэму, у якой аўтар не арыентуецца; калі ж прыёмы (на карысць адпаведнасці формы і зместу) прыбіраюцца зусім — застаецца толькі фармальна зрыфмаваная думка, якая не цягне нават на публіцыстычнасць.

Калі пачынаецца раздзел з прысвячэннямі — пытанняў паўстае больш. Вершы тут нагадваюць хутчэй віншаванні з паштовак, а не паўнавартасныя творы. Біяграфізму яшчэ не дастаткова для ператварэння перажыта-шчырага аповеду ў вершаваную матэрыю, выключная большасць тэкстаў — страфічныя кампліменты розных ступеняў узвышанасці, напісаныя ад другой ці трэцяй асобы. Апагеем непаэтычнасці ў гэтым раздзеле з'яўляюцца наступныя радкі:



«Добрай раніцы, рака!
Вожык, прывітанне!
Вось табе мая рука,
Конь, сустрэты з рання!

Кінуў вуду я ў раку
І сяджу, чакаю…
Мо якому шчупаку
Адкажу: "Вітаю!"»

Гэта цэльны верш, які складаецца з двух, поўных мастацкага імпэту, строф. Кампазіцыйная складанасць уражвае, акрабатычна-моўныя кульбіты і гарманічныя пералівы сэнсаў граюць іскрыстым паэтычным супам на рагавіцы чытацкіх вачэй… Гэта нават дзіцячым вершам не назавеш, бо ён не нясе аніякай выхаваўчай функцыі. І наогул нічога, акрамя рытму і рыфмаў, не нясе. Хай сабе чалавек, якому гэтыя радкі прысвечаныя, заўзяты рыбак — гэта ж усё роўна кніга паэзіі, а не рыфмаваных успамінаў. Хаця да ўспамінаў гэта не падобна, бо не хапае біяграфічнага факта.

І калі здаецца, што ўсё: на гэтым падводная частка айсберга скончылася, — недзе знізу б'е рыбіна ніжэйшага штылю вершатвораў — афарастычных мініяцюр. Слава Ігара Губермана непакоіць многіх, але далёка не кожны пісьменнік разумее, што для напісання нечага лаканічнага трэба прыкладаць нашмат больш намаганняў, чым для напісання чагосьці сур'ёзнага: для такіх творцаў малы памер не асацыіруецца з павелічэннем сэнсавай гушчыні, а звязаны выключна з памяншэннем часу працы з творам. Адсюль — адпаведны ўзровень тэкстаў:

«Я сэрца сваё не пакіну
Усюды, куды ні памкнуся…
Дзе сэрца маё, там Айчына.
З айчынай маёй — Беларуссю…»

Альбо:

«Ціхамірна скончыць сварку:
Выпіць чарку, з'есці скварку,
Паварушыць чорным вусам…
Што шчэ трэба беларусам?»

У пэўным кантэксце гэтыя радкі маглі б выратаваць аўтара з дапамогай іроніі, але тут яе дакладна няма. Хіба што толькі ў другім вершы праглядаецца нешта падобнае да яе, але нават там сюжэт тыповы насто-о-о-олькі, што нават на білбордзе з рэкламай паслуг гэтыя радкі не спрацавалі б. З-за падобных тэкстаў часам здаецца, што беларускія паэты існуюць у вымярэнні мінус-мовы, якая будуецца выключна са стэрэатыпаў, і любы немастак — ад дворніка да бізнесмена — бачыць Беларусь адначасова і больш рэальна, і больш паэтычна.

Тое, што пісалася ў прадмове пра апошні раздзел, вельмі тонка, амаль іранічна, адпавядае рэальнаму стану тэкстаў. Яны на самай справе лепей за мініяцюры і прысвячэнні за кошт існавання гістарычнай фактуры. Але калі гаварыць пра іх моўна-стылявое афармленне — пачынаецца тое ж ваганне: у больш лірычных творах перабольшванне з паэтычнай узнёсласцю, у больш наратыўных — з прамалінейнай апавядальнасцю. Але ўсё ж ёсць і некаторыя прыгожыя радкі, па якіх сапраўды відаць, што аўтар гаворыць пра перажытае. Шкада толькі, што хутчэй гісторыя вядзе за сабою аўтара і надае колер яго радкам, а не паэт, карыстаючыся матэрыялам, выбудоўвае тое, што патрэбна яму самому.

Данііл ЛЫСЕНКА

Ігар ПРАКАПОВІЧ

***

Першы марозік і шэрань на дрэвах.
Абледзянелыя шыбы ў машыне.
Восень мінула ў вятрах і залевах,
І вось паветра заўважна так стыне.

Крыгі раллі сівізна атачыла,
Лужына зіхкім блішчыць крышталём,
І ручаіны блакітная жыла
Бліскае зырка іскрыстым агнём.

Як жа усё гарманічна на свеце:
З'явы жыцця захапленне нясуць.
Першы мароз зледзяніць у паэце
Ржавых пачуццяў згусцелую муць.

Яснае неба абудзіць узнёсласць,
Думкі і мары ў сусвет паляцяць.
Сэрца забудзе гады і дарасласць
І будзе зноўку кахаць…

***

Сумная восень, не трэба спяшацца
Сыпаць на сэрцы сухія лісты.
Дай закаханым наабдымацца
У цеплыні мілаты.

Лёгкая хваля пачуцці лагодзіць,
Шчасце суздром карагоды вядзе.
Сумная восень намерана шкодзіць
І гэтак шпарка ідзе…

Дзяўчыне з зоркі Міра Кіта

І мне так холадна, няўтульна без цябе.
Нібыта ўсе вятры, што ёсць на свеце,
Зляцеліся ў душу і ў змрочнай варажбе
Імкнуцца шабаш зладзіць у паэце.

Іграе комін, рэжа скрыпкай дрот,
І лупіць дождж у лужыны-цымбалы.
Прырода паўтарае з году ў год
Свае фактроты, полькі і харалы.

Пара прывыкнуць да сляпых вятроў,
Да восені і мокрай, і мінорнай.
І грэць сябе надзеяй, што ізноў
З табой сустрэнуся
шчаслівай ночкай зорнай…

Словы малітвы

Я ў храме ля святынь,
Молячы, прашу:
«Божа мілы, не пакінь
Ты маю душу.
Адпусці мае грахі
У далёкі край,
І шчаслівыя шляхі
З сабой побач дай.
Я старацца буду жыць
Так, як хочаш ты:
Як агонь святы гарыць,
Як цвітуць сады.
Я напоўніцца хачу
Ўвесь тваім святлом
І цямрэчу не ўпусціць
У сардэчны дом».
Вось таму каля святынь
У Цябе прашу:
«Божа мілы, не пакінь
Ты маю душу…»

***

Жыццё праходзіць ад кахання
да кахання
Сярод будынкаў шэрых і дарог.
Жыццё праходзіць ад чакання
да чакання,
Бо так задумаў гэты свет сам Бог.

І нам не дадзена зірнуць у невядомасць,
Убачыць тое, што рыхтуе лёс.
Бо нас вядзе па свеце несвядомасць —
Спляценне праўды, выдумкі і кроз.

Мільгаюць дні, імчыцца стужка часу.
Былых спатканняў зарастае след.
І набывае жоўтую акрасу
Святочны і шматколерны сюжэт.

Ты ўжо ідзеш да новага кахання.
Я застаюся, сумны, у былым.
Зняверaны, спустошаны дазвання,
Глытаю ўспамінаў горкі дым.

Жыццё праходзіць ад сустрэчы
да сустрэчы
Сярод будынкаў шэрых і дарог.
А боль расстання мудры час залечыць,
Бо так задумаў гэта ўсё сам Бог…

***

Злятаюць зоркі легкакрылыя
На гладзь вячэрнюю азёрную.
Што робіш ты, дзяўчынка мілая,
Сам-насам у часіну зорную?

Мо табе мрояцца далёкія
Краіны райскія, прыветныя,
Дзе мары ў кожнага — высокія,
Пачуцці — чыстыя і светлыя.

Дзе твары свецяцца — усмешкамі,
Дзе песні шчасця не канчаюцца,
Дзе залатымі ходзяць сцежкамі,
Дзе сны прыгожыя збываюцца.

І, можа быць, часінай зорнаю
У той краіне мы спаткаемся
Калі на гладзь вады азёрную
Чароўна зорачкі злятаюцца…

Хутар за рэчкай

Хутар за рэчкай ужо абаралі —
Ён адзінока стаіць на вятрах.
Яблыні лісце сваё раскідалі,
Нібы лісты да таго, хто ў гасцях.

Печка ў хаціне без полымя стыне.
Воўк па дварышчы спакойна гуляў.
… Быў пазаўчора тут сын
на машыне —
Бацьку з сабою ў горад забраў.

Доўгія ўсё-ткі былі угаворы.
Трэсліся рукі, блішчэла сляза.
Каб жа крапчэйшы быў…
Каб жа не хворы…
Эх, не рабіць ужо, і не казаць…

Будзе вятрыска гукаць каля ганку,
Бразгаць дажджом у аконнае шкло.
Толькі ніхто не адгорне фіранку,
Толькі ніхто не запаліць святло.

З яблыняў лісце ляціць цераз поле
Нібыта з хутару ў горад лісты…
Кожнаму ў свеце наважана доля
Ў часе квітнення
і нематы…

***

Калі за вокнамі лажыцца першы снег
І далячынь счарнелая святлее,
Душы так хочацца змяніць
прывычны бег
І паляцець.
Няхай ушчэнт здрабнее
Вялікі стос нязрушаных праблем,
І пачуццё, што ўжо зусім не грэе.
Да новых высяў!
Без жыццёвых схем
Без трафарэтаў, без сустрэч
пустэчы
Да новых слоў і нераскрытых тэм,
Да новых даляў!
Там, сярод сінечы,
Бліжэй да Бога, Сонца і цяпла,
Узвысяцца памкненні, справы, рэчы
І ў пыл
рассыплецца скала...

Кацярына ТАРАСАВА

Пярсцёнак-ліхтар

Усё... Пярсцёнак стаў вялікім
Для пальцаў дробных ліхтароў
Святло распушчанае ў плітах
Невымяральна не сваё.

Не цісне постаць у паветры
І адбіваецца ад сцен.
Нібы пашыраны ў памеры
Асіметрычны жоўты цень

Не разбіваецца аб рукі—
Заслоны між начных агнёў...
Пярсцёнак стаў зусім вялікі.
Па-за ліхтарны. Не яго.

***

Горкай вады змяшанай з пяском і кроўю
П'юць за тваё здароўе
Чарку з тваёй магілы.

Не глядзі

Стой!
Не глядзі — слухай!
Тут яшчэ зусім глуха.
Усё гучыць не так моцна.
Слухай, не глядзі — сонца
Бегае вадой у моры
Носіцца лясным воем.
Чуеш — цішыня?
Глуха.
Колькі не напружвай вуха.

***

Я даўно ўжо не белы Анёл,
Перабітая птушка,
Аскепак
Незапальнага сонца агню.
Зноўку раніца.
Панядзелак.

Усё мінае ў цемры начной
І зрастаецца на аддаленнях.
Тыдзень — сплаўлены ў топцы спакой
Нараджаецца ў час заканчэння.
Я даўно ўжо не белы анёл.
Перакрыўлена плямамі пер'е.
І не птушка.
Не снег.
Не агонь
А забытае з часам
павер'е.

29.10.1937-29.10.2019

Выстрал, нібыта зорка, якая падае.
Кажуць:
— Глядзі, глядзі
Загадай жаданае.
Вочы заплюшчы,
Перажагнайся тройчы!
Падаюць сярод ночы.
Песні
Ідуць у неба.

Я ўсё б забыў, ды нешта яшчэ не спета.
Нешта не спіта
з донца вялікай ямы —
Вершы з незакрэсленымі радкамі.

***

Падае верталёт.
Нехта бяжыць, справуе
ўратавацца.
А ты стаіш.

Не хапайся за галаву!
Не крычы!
Не плач!
Ён усё адно ўпадзе.
Раздзярэ пад'езд дзевяціпавярховага
дома разам з людзьмі
Ці цябе,
Але ты нічога не зробіш.

Проста сачы за веліччу.
Разумей — калі ўпадзе на цябе —
не паспееш збегчы.
Калі ўпадзе на людзей — не ўратуеш.
Зараз не ты пілот.

Разбіваешся аб пад'езд
дзевяціпавярховага дома.

Нехта стаіць,
Чакае —
Раптам цэлы
Ці ты,
Ці пад'езд,
Ці людзі.

Фота Кастуся Дробава.

Яна БУДОВІЧ

На магіле Уладзіміра Караткевіча

У люстры граніту —
бязмежжа блакіту
і вострaў сонца.
Аблокаў скарбонкі,
скуль соснаў махнатыя верацёнцы
вышкрэбваюць вонкі
як снегу шматкі, мурашоў,
што цякуць ланцужкамі
скрозь травы
і лісце сухое,
дзе тое,
што будзе й было,
паяднана ў адно.
Дзе кожны для кожнага — госць,
цяжар ці крыло.
Дзе вечны спакой і бязважкасць сноў
прашыты наскрозь жыццём.
Вавёркай, чмялём, мурашом.
...Ты быў, але будзеш і ёсць.

***

Як рэчка выступае з берагоў,
з глыбіняў неба — зграі варання —
над дахамі астылых гарадоў
у халадэчу восеньскага дня.

Выплёўваюць трывогу ўсё гучней...
І ты міжволі паскараеш крок,
Жадзён у шмат, у шмат разоў мацней
цяпла таго, што грэе ледзь здалёк...

Э Ц Ю Д Ы

Уладзімір СЦЯПАН

Чапа

Туманна-ружовы ранак. Па вуліцы бяжыць чорны цуцык нямога Ягора, а за ім Чапа — ладная вастравухая сучка майго сябра. Сам жа ён круціцца побач з легкавіком — збіраецца на працу. Заўважае, што Чапа змагла пазбавіцца ашыйніка і збегла з двара.

— Чапа, Чапа, хадзі дамоў! — гукае сябар і выходзіць з двара на вуліцу.

Бачыць сваю сучку і зноў, але злосна і пагрозліва, пачынае яе клікаць. Чапа бяжыць, круціць хвастом, на гаспадара не азіраецца. А ён бачыць мяне (я гавару па тэлефоне), просіць:

— Затрымай, Валодзька, сучку, яна цябе паслухае!

Нахіляюся, і Чапа кідаецца да мяне, падскоквае, закідвае мне на плечы брудныя лапы і ліжа ў шчаку.

— За загрывак яе трымай, яна не вырвецца, ёй гэта падабаецца! — кажа сусед і няспешна, каб не спалохаць, ідзе да нас.

Хапае Чапу за карак і трасе ёй перад носам кулаком, потым падхоплівае яе на рукі і нясе ў двор.

— Даўно я дзевак не насіў на руках!

На ганак хаты выходзіць Рытка, глядзіць на мужа з Чапай на руках з такой сумнай усмешкай, што мой сябар не вытрымлівае і кажа:

— А то я цябе так не насіў, можна падумаць...

— Калі тое было... — заўважае Рытка і садзіцца ў легкавік.

Ноч

Выйшаў у двор. На гадзінніку — палова на трэцюю ночы. Вёска спіць. Глянуў у неба, ад краю да краю ў бліскучых зорах: сіняватых, залацістых, бэзавых, белых, паўпразрыстых, яркіх, халодных і цёплых. Яны здаюцца нізкімі — рукой можна дацягнуцца... Згадаўся радок Маякоўскага «Ночи августа звездой набиты нагусто...» Глядзеў на Млечны Шлях і думаў пра зоры і пра сябе... Адчуў, як мне робіцца млосна, быццам ганак выслізвае з пад ног: моцны бетонны, з шырокімі дошкамі. Мне стала кепска, і я прысеў, апусціў галаву і адчуў: плачу ад уласнай бездапаможнасці і мізэрнасці.

На верандзе глынуў вады, лёг у ложак, прыйшла кошка. Я пагладзіў яе мяккую поўсць, нямоцна сціснуў пальцамі карак і падумаў, што бог дае катам і сабакам скуру з мяккай поўсцю на выраст, на некалькі памераў большую, чым ім трэба...

У акне зіхцела зорка, кошка вуркатала пад маёй рукой.

Урок прыродазнаўства

Надзя (ёй гадоў семдзесят) выйшла з двара на вуліцу з літровым слоікам, закрытым капронавай накрыўкай. Паглядзела па баках і гукнула сямігадовага ўнука:

— Кіруша-Кіруша, хадзі сюды! Глядзі што пакажу!

Запыханы хлопчык, апрануты па-гарадскому, прыбег да бабулі.

— Ну, што ты пакажаш?

— Глядзі сюды.

Жанчына трасе слоік. У ім на дне варушыцца нешта шэрае. Кіруша ўзіраецца, моршчыцца і крыху разгублена ўсміхаецца, спрабуе і не можа зразумець, што там за празрыстым шклом.

— Гэта, Кіруша, лятучая мыш.

— Мыш? — малы адымае далоні ад слоіка і грэбліва крывіцца.

— Для цябе знайшла. Яна яшчэ маленькая, як ты. Можа, і лётаць не навучылася. Бяры, гуляй.

Кіруша адыходзіць на крок, а потым пераадольвае гідлівасць і пачынае разглядаць маленькага кажана.

Парачка

Бывае раз, а часцей некалькі разоў на дзень хаджу на кладку над малой рэчкай Ідутай (кладку шмат разоў фатаграфаваў). Стаю і гляджу, як цячэ вада, як сінхронна хістаюцца і выцягваюцца, быццам ударлявыя гімнасты, водарасці...

Там, метраў за шэсць ад мяне, асабліва калі свеціць сонца і святло працінае ваду, робіцца бачным невялікі пясчаны пагорак. Вакол — гарлачыкі, чарот, аер, кусты парэчак, лаза, высокая трава з сухімі мяцёлачкамі.

Калі стаяць нерухома і ўзірацца, то можна ўбачыць пару галаўнёў, якія хаваюцца пад лісцем гарлачыкаў. Меншы — пару кілаграмаў, а яго таварыш — яшчэ большы. Яны з'яўляюцца над жоўтым пясочкам і на некалькі імгненняў робяцца бачнымі. Бывае, уздымаюцца і хапаюць з паверхні муху, страказу ці яшчэ якую казюрку.

Вядома, гэтых галаўнёў можна злавіць, а потым сфатаграфаваць і хваліцца незвычайнымі трафеямі.

Можна!

Але мне больш падабаецца маўкліва і стоена глядзець на гэтых дужых і хуткіх рыб, на іх хуткія цені, на барвовыя пёры плаўнікоў. Нават вяскоўцам я не расказваю пра сваіх галаўнёў, пра цудоўную парачку.

Малышок

Мішка едзе на самаробным трактарку. Спыняецца. Вітаемся.

— А дзе твой конік? Здаецца, Малышок? — пытаю і разглядаю трактарок.

— Зімой у хляве здох. Стары быў — трыццаць чатыры гады. Як для каня — дык гэта як сто чалавеку... Добра пажыў. Цяпер у мяне жалезны.

— Шкада...

— І не кажы... Леснікі прыехалі, пасеклі на кавалкі, каб ліс карміць, а што засталося, у кар'еры закапалі.

— І як яно, на жалезным?

— Ведаеш, няблага, але жывы лепей, бо шмат дзешавей... А гэтаму салярка трэба, амартызацыя... Не пакалыміш, як на жывым... А галоўнае — не пагаворыш... — сказаў сямідзесяцігадовы гаспадар блакітнага трактарка і паехаў, запыхкаў дымам.

Козы

Уладзіміраўне за восемдзесят. Столькі ж — і Валодзю, яе мужу. У іхняй гаспадарцы пяць коз і чатыры каровы. Уладзіміраўна ўздыхнула, далоні да скроняў прыціснула і кажа:

— А забярыце нашых коз. Дарма аддам, а то мне так іх шкада... А мы з Валодзем не дужаем іх глядзець... Харошыя козы, і казёл спраўны... Забярыце хоць у які цырк ці заапарк... Толькі няхай самавывазам... Каб прыехалі, хутка загрузілі, павезлі. У цырк — на корм звярам — забярыце!

Мы з жонкай ішлі вясковай вуліцай і маўчалі да самай кладкі. Там я пачаў паказваць ёй галаўнёў, але яна не захацела глядзець на прыгожых рыб.

Мядзянка

Саракагадовая Вольга біла доўгім дубцом па траве пасярэдзіне дарогі. Хвастала, секла і крычала:

— Змяя! Змяя!

Калі я падышоў, то яна ўсё яшчэ біла невялікую мядзянку, якая і не варушылася.

— Вольга, яна ж не кусаецца, нашто ты яе?

— Не кусаецца, скажаш такое... Яна цяжарная! Глядзі, малыя з яе павылазілі, як чарвякі чорныя.

— Дарма ты яе забіла...

— Яна да маёй хаты паўзла... А там унукі. Можа, і не кусаецца, але спужае моцна... Паняў?

Я пайшоў па дарозе, а Вольга з доўгім дубцом пайшла да ракі, дзе пасвіліся белыя козы.

Коршак

Вясковыя пахі, водары: начныя, ранішнія, дзённыя, вечаровыя...

Запамінаю, запісваю, збіраю, як пчала з розных кветак...

Вяртаемся з дачкой з возера. Пакупаліся, памыліся, пахнем шампунем. Насустрач па сцежцы ідзе жанчына. Павіталіся, разышліся. Вясковая жанчына густа і смачна пахла малаком. Так моцна, што гэты просты пах ішоў з намі крокаў сто. А потым змяшаўся з водарамі цёплага пылу на дарозе, кветак і звялай травы...

У апошніх промнях пераляцеў дарогу коршак. Яго літое цела загарэлася, заззяла. Імгненне шэры коршак пабыў казачным вогненным птахам. Прымроіўся пах птушынай крыві...

Яблыня

Дом, сіні калодзеж, лазня, гараж, пуня, паветра і трава… Здаецца, усё на гэтых трыццаці сотках на месцы, але нешта не так, нешта змянілася…

Зразумеў адразу: знікла яблыня, якая, колькі памятаю, расла за чатыры крокі ад калодзежа і за восем ад высокага ганка. Я любіў адшчыкнуць ці падняць з травы яблык, выцерці аб калашыну, сесці на ганак ці на лаву пры калодзежы і няспешна з'есці, а потым думаць, куды б кінуць абгрызак. Здаралася, што сядзеў нерухома на ганку, глядзеў на траву, неба, на пустую суседнюю хату ці на той жа белы наліў і лічыў яблыкі на галінах.

Апошнія гадоў пяць яблыня хварэла, і мы спрабавалі яе ўратаваць. У спёку паліваллі цёплай вадой. Па восені абразалі, замазвалі садовым варам сляды пілы. Труцілі мурашоў, якія выгрызлі ў камлі дупло і жылі ў ім. Радаваліся, калі прылятаў дзяцел і доўга дзёўб нашу яблыню…

Жонка стрыгла дробнае галлё секатарам, прасіла, каб я нарабіў падпорак і паставіў пад абцяжаранае пладамі дрэва.

Ішоў з сякерай на балота, парослае алешнікам і асіннікам, вяртаўся з падпоркамі.

Можа, яблыня адчувала наш клопат? Кожны год на ёй з'яўляліся плады. Нават калі засталася адна вялікая галіна, то яблыня працягвала радзіць і радаваць важкімі і смачнымі пладамі. Іх было не так і многа, але выглядалі яны спакушальна: кожны яблык — як вялікі шар. Людзі — што дарослыя, што дзеці — дзівіліся на яблыкі і прасіліся папіць вады. Заходзілі ў двор, адкідвалі накрыўку калодзежа, грымелі ланцугом, выцягвалі вядро, пілі. І абавязкова, калі з нашага дазволу, а часцей не пытаючыся, выбіралі і адрывалі сабе самы лепшы яблык. Выходзілі на дарогу, кусалі, крывіліся і выкідалі пад плот, у траву, у кусты. Вядома, яблык той хоць і выглядаў прывабна, але яшчэ як след не выспеў. Мяне і жонку гэта моцна злавала, мы нават сварыліся. За гэта вяскоўцы лічылі нас гарадскімі куркулямі.

Яблыкаў штодня рабілася ўсё менш і менш. Я іх фатаграфаваў, маляваў, разглядаў, еў і радаваўся, калі на яго садзілася драпежная аса і перабірала лапкамі, мачыла іх у салодкі сок.

Пра ўсё гэта я падумаў і згадаў, пакуль адчыняў шматлікія замкі і пераносіў з машыны ў дом рэчы… Жонка насцярожана азіралася, а потым заўважыла, што сусед скасіў разам з травой чатыры кусты півоніі, і замаркоцілася… Пра кветкі я сказаў, што няма чаго хвалявацца, даўно адкрасавалі, а на наступны год вырастуць лепшыя. Але яна ўсё тапталася побач з калодзежам, глядзела пад ногі, быццам бы заблудзілася і не магла зразумець, куды ж ісці?

Нарэшце яна ўбачыла пянёк. Яблыню спілавалі пры самай зямлі. Яна глядзела на яго, потым — на мяне, на хату, на сіні калодзеж, на куст язміну. Быццам пыталася: што адбылося, куды падзелася дрэва — любімая яблынька. Хворая, з адной галінай?..

Прыйшоў Дзімка, сусед з хаты насупраць. Расказаў, як на самым пачатку лета чорная хмара зацягнула неба, як пачаўся вецер, лес паваліў, вялікія дрэвы павыкручваў… І яблыню ён зламіў. Яна так упала, што да лазні не прайсці. Хацеў быў пазваніць нам, але грошай на тэлефоне не было… Таму прынёс бензапілу і зрабіў парадак… Камель распілаваў на цурбэлкі і склаў за лазняй. Не выкідаць жа — дровы…

Жонка пайшла ў дом і пачала плакаць…

А Дзімка патаптаўся і сказаў:

— Я кінуў курыць, але калі ўгасціш, то курну… А яблыня была старая — што па ёй гаравацъ. Восенню можна новую пасадзіць, калі так хочацца…

Бяроза

Аднойчы, позняй восенню, зайшоў да вясковага суседа. Валодзька сядзеў на ўслончыку, паліў у грубцы, курыў. Пахла ў хаце нязвыкла. Я спытаў, ці не сапсавалася грубка? Валодзька сказаў, што гэта так пахнуць новыя дровы... З той самай бярозы, што бацька ягоны пасадзіў паўстагоддзя таму, побач з хатай... А ён спілаваў, бо маланка пабіла бярозу, на хату магла паваліцца.

Мы доўга маўчалі...

Слухалі, як шуміць агонь.

Забава

Так ціха ў вёсцы, што вушы закладае. Каштаны і бэз квітнеюць, быццам букетаў нехта панастаўляў побач з хатамі і слупамі. Нейкі рух і прысутнасць жывога толькі побач з крамай. Там, на ганку пры дзвярах, руды кот ляжыць — грэецца, бо стары. Пад бярозай, у цяньку, тры мужчыны-п'янтосы. Побач з імі топчацца нягеглы певень.

Адзін п'яніца сядзіць на бервяне, а яго таварышы — на маладой траве. У іх дзве бутэлькі моцнага віна, тры пластыкавыя кубачкі, палова бохана хлеба, пачак цыгарэт. Яны п'юць, размаўляюць, мачаюць хлеб у віно і кідаюць пеўню. Той радасна дзяўбе і праз чвэрць гадзіны пачынае хістацца, тропаць крыламі і падаць.

Мужчыны смяюцца. Руды кот расплюшчвае вочы і глядзіць, ці не збіраюцца чаго даць і яму. Певень спрабуе стаць, але падае на бок.

Цёплы травень. Усё жыве і квітнее.

Амаль казачнае

«Прыйшла фельчарка, паслухала, таблетак дала і сказала, каб я булён ела з курЫцы. Я злавіла пеўня, ногі яму матузом звязала, узяла яго і пайшла да Віцькі, каб ён галаву майму пеўню адсек. Прыйшла, а Віцька як паехаў першым аўтобусам ў бальніцу, так і не вярнуўся. Я дамоў ледзь дайшла. Снежная зіма была. Пеўня развязала, пусціла да курЫц… А праз тры дні паправілася, так ён і застаўся жывы... А Віцька памёр у бальніцы. Во як! А певень добры, такі добры — не расказаць. Можа, калі раззлуецца, і дзеўбануць, але ж добры…».

Так расказвала Данілаўна пра пеўня, які хадзіў па двары. Я ж адразу зіму тую снежную ўбачыў. І старую Данілаўну ў чорным кажусе і шэрай хустцы, якая нясе свайго пеўня са звязанымі чырвоным матузом залатымі лапамі. Снег рыпіць, Данілаўна войкае і ўздыхае.

Сны

Некалі чытаў, што прысніць можна толькі тое, што насамрэч бачыў у жыцці. Але ў мяне бываюць сны, у якіх бачу абсалютна незнаёмых мужчын і жанчын. Там, у снах з імі знаёмлюся, размаўляю. Потым праходзіць час, месяц, год ці два, і той сон забываецца, як і не было яго. І раптам, вось як заўчора, еду ў метро. У вагон на «Усходзе» заскоквае мужчына. Глядзіць на мяне зацікаўлена і крыху спалохана. Пачынае расшпільваць паліто, толькі верхні гузік паспеў... А я ведаў, што пад паліто — белы швэдар з чырвонымі аленямі, а пад аленямі — тры тонкія чырвоныя паскі… Так і аказалася. Ён сеў насупраць і ўсё паглядаў на мяне, а я — на яго аленяў. А яшчэ я ведаў напэўна, што ў правай кішэні цёмна-сіняга паліто — тры каштаны і маленькі ліхтарык…

Я не даехаў два прыпынкі.

Мужчына запытальна глядзеў мне ўслед.

Удваіх? Ці ўдвух?..

У беларускай мове вылучаецца абмежаваная група прыслоўяў, утвораных парамі ад колькасных і зборных лічэбнікаў: *удвух (удзвюх) / удваіх, утрох / утраіх, учатырох / учацвярых* і г. д. Першыя ўжываюцца ў дачыненні да асоб аднаго полу (або мужчын, або жанчын), другія — у дачыненні да асоб рознага полу ці істот ніякага роду. Параўнаем: *Глядзелі* ***ўтрох*** *на гэты сшытак / І ўсё разгледзелі да нітак. / І хлопцы тут пасябравалі...* (Якуб Колас); *Жнуць* ***удваіх****, маці з сынам* (Іван Мележ); «*Мсціслаў, Пятрок Ясюкевіч, Мацей Біскуповіч, Усяслаў Грыма... ну, і я. Мы* ***ўпяцёх*** *узяліся за людзей, якіх ведалі*» (Уладзімір Караткевіч).

Пры рэдактарскім аналізе адлічэбнікавых прыслоўяў са значэннем сумеснасці абавязковае патрабаванне — мысленчае мадэляванне створанай аўтарам рэферэнтнай сітуацыі, у якой мусіць выразна прасочвацца родавая прыналежнасць названых асоб. Напрыклад, азнаёміўшыся са сказам *Адразу ж усе* ***ўчатырох*** *апамятаваліся, ці можа, праўдзівей сказаць, дарэшты страцілі развагу* (Кузьма Чорны), рэдактар суадносіць выказванне з папярэднім кантэкстам: усе, хто ганяўся за быком, — асобы мужчынскага полу, і прыслоўе ўчатырох выкарыстана правільна. І наадварот: *Учора сустрэліся* ***ўчатырох*** *з ім* [сябрам], *нявестай і сведкай, каб абмеркаваць дэталі.* Гурт суразмоўцаў складаўся з хлопцаў і дзяўчат, таму правільнае прыслоўе *ўчацвярых*.

Пэўны ўплыў на выкарыстанне паданалізных прыслоўяў робіць сітуацыя двухмоўя, бо ў рускай мове адсутнічае падобная родавая дыферэнцыяцыя: *вдвоем, втроем* і г. д. Чытаем інфармацыю пра трох рыбакоў: *Па словах выратаваных, рыбачылі яны* ***ўтраіх, утраіх*** *жа і патрапілі ў ваду* (трэба ўтрох) і пра сям'ю: «*Часта бывае, што мы абдымаемся адразу* ***ўтрох*** *— і цалуем адно аднаго. Так усе крыўды і беды праходзяць», — адкрываецца сапраўдны сакрэт шчасця сям'і Плехтан* (трэба ўтраіх).

Асабліва неабходна сачыць за прыслоўямі *ўдвух, ўдзвюх* і *ўдваіх*. Мужчынскі пол у адносінах да асоб, суадносных з першым прыслоўем, выяўляецца ў сказе: *Іван Іосіфавіч Анімуцкі і Славамір Антонавіч Мізула з СВК «Гудагай»* ***удвух*** *перасушылі больш за 3 тысячы тон зерня і рапсу;* жаночы пол — у сказе: *Дзве жабінкаўскія дзяўчынкі, якія, вядома, не такія знакамітыя, як пісьменнікі Ільф і Пятроў, але ж у сваім юным узросце зрабілі вельмі шмат* ***удзвюх****;* розны пол — у сказе: «*Дык тады тут жылі — чакай, дачушка! — Багданы* ***ўдваіх****, Вінькавы* ***ўдваіх****, Драздовы* ***ўдваіх***»… Патрабуецца праўка: «*Я па беларускіх мерках зарабляю добрыя грошы. Раней, калі жонка атрымлівала зусім мала, мы нармальна жылі на маю зарплату* ***ўдвух***» (трэба ўдваіх). Цікавы выпадак персаніфікацыі прыслоўя зафіксаваны ў вершы Казіміра Камейшы: *Ці ў даўняй згадцы ці на здымку / Заўсёды бачу, як праз сон: / Ідуць* ***удвух*** *яны ў абдымку — / Паэт і ён, акардэон.*

У звязку з гэтым варта перасцерагчы ад неабгрунтаванага ўжывання прыслоўя ўдваіх, бо тут білінгвальная інтэрферэнцыя выклікае незапланаванае пашырэнне сэнсу выказвання. У сказе-запрашэнні *Прыходзьце на выставу «Мумії свету»* ***ўдваіх*** *— плаціце за аднаго* сэнс выказвання энтрапічны: атрымаем ільготу толькі тады, калі прыйдзем з асобай супрацьлеглага полу, або будзем наведвальнікамі-дзецьмі?

У тэкстах сустракаецца і прыслоўе *ўдвох*, якое ў слоўніках мае памету *абл.* (дыялектнае) і ўжываецца толькі ў дачыненні да мужчын. Як і раней, *удвох* сустракаецца ў творах мастацкай літаратуры: *Застаўшыся* ***ўдвох****, Дземідовіч павярнуў галаву да капітана* (Васіль Быкаў); *І мы* ***ўдвох*** *— навалач-беларусы* (Андрусь Горват).

Увага, засяроджаная на кожным слове тэксту, дазволіць у максімальнай ступені данесці сэнс аўтарскага выказвання да чытача.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

згадка

Рэха сяброўства

Уладзімір Караткевіч — Міхаіл Рылко

Калісьці жыў на вуліцы Жыровіцкай у Слоніме ў прыватным доме былы журналіст «Знамя юности», «Голасу Радзімы», «Гродзенскай праўды», калекцыянер і цікавы чалавек Міхаіл Рылко (1934—2012). Аб'ездзіў некалі ўсю Гродзеншчыну, напісаў некалькі кніг, сярод якіх — «Чайкоўскія», «Красный поезд», «Слонім» (у суаўтарстве), «Рэнесанс беларускага мястэчка».

У 1997 годзе са сваіх калекцый слонімец стварыў этнаграфічны музей-майстэрню «Беларускае мястэчка», на аснове якога дзейнічала культурна-асветнае таварыства «Вечавыя званы». Я часта бываў у яго хаце-музеі, шмат гутарыў з Міхаілам Іванавічам. Гэта быў вельмі апантаны жыццём чалавек, энцыклапедыст. Але найбольш уражвала вялікая калекцыя старых рэчаў: ад кніг і паштовак да розных гаспадарчых прылад, прасаў, посуду, гадзіннікаў, карцін, сярпоў і клямак. Яны былі ўсюды: у пакоях хаты, у хлеўчуку, на гарышчы. Цяпер у хаце гэтай жывуць іншыя людзі. Памерла і яго жонка Ірына Рылко. А дачка ўсё нажытае прадала і жыве ў Польшчы.

А тады сярод наведвальнікаў было шмат пісьменнікаў. Часта гасцілі Віктар Шымук, Юрась Свірка, Алесь Ставер, Раман Тармола, Сцяпан Кухараў, Гаўрыіл Шутэнка ды іншыя. «Ужо колькі год, як мы з табой, Міхась, знаёмы, і я не ведаў, які ты ў сваёй чысціні і справядлівасці чалавек і літаратар, і патрыёт-беларус, які ўмее шанаваць дружбу і прыняць госця ў сваёй хаце. Такіх людзей, улюбёных у сваю справу, якія не шкадуюць сіл і таленту для шчасця і працвітання роднага краю, Бацькаўшчыны трэба ўсяляк падтрымліваць...» Такі запіс пакінуў яму паэт Сцяпан Кухараў на адной са сваіх кніг.

А з Уладзімірам Караткевічам Міхаіл Рылко пазнаёміўся на адным са школьных вечароў у Слоніме на пачатку 1970-х. Школьнікі чыталі вершы. Але Караткевіч не вельмі ўважліва іх слухаў. І раптам ён усхапіўся, схіліўся ў той бок, дзе хлопчык пачаў чытаць свой верш пра снежныя гонкі на лыжах. Лыжы ў яго аказаліся тупаносымі. І Уладзімір Караткевіч спытаў у школьніка, хто «змайстраваў» яму той нос, а потым перапытаў, ці сам ён гэта зрабіў, ці настаўніца? Паэту спадабаўся вобраз, а Міхаіл Рылко, які сядзеў недалёка, той вобраз не зразумеў. І спытаў у Караткевіча, ці не занадта «падручны» ва ўжыванні той вобраз. «А можа, я пытаюся пра нейкае глупства?» — дадаў Міхаіл Рылко. Караткевіч шчыра рассмяяўся і сказаў, што ніякага тут няма глупства. «І каб упэўніцца ў тым, варта да "тупаносых" дабавіць яшчэ "востраносых", а можа нават і "бязносых", <...> каб ажывіць верш», — дадаў Уладзімір Сямёнавіч.

Фота з уласнага архіва Сяргея Чыгрына (друкуецца ўпершыню).

На сустрэчы ў Валеўскай сярэдняй школе Навагрудскага раёна (справа налева Міхась Петрыкевіч, Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч). 1960-я гады.

З Уладзімірам Караткевічам Міхаіл Рылко сустракаўся ў Слоніме яшчэ некалькі разоў.

А жонка Міхаіла Ірына Рылко неяк пад восень паехала ў Ялту на адпачынак. І... сустрэлася нечакана з Караткевічам, які адразу яе пазнаў. Ірына Рылко не магла сагрэцца пад не вельмі ласкавымі промнямі восеньскага сонца. Каб хоць неяк развесяліць жанчыну, Уладзімір Караткевіч напісаў экспромцік: «Я ляжу на пляжу і ад холаду дрыжу». Пляжніцы нічога не заставалася, як толькі весела рассмяяцца.

Яны доўга размаўлялі, жартавалі, што аж пачулі рыбакі, якія пачаставалі іх юшкаю. Мясцовыя аматары рыбы, як аказалася, даўно ведалі Уладзіміра Сямёнавіча. Запрасілі Ірыну з Уладзімірам пакатацца на баркасе, выйсці ў адкрытае мора. І тыя пагадзіліся…

У Міхаіла і Ірыны Рылко шмат гадоў захоўвалася кніга Уладзіміра Караткевіча «Мая Іліяда» з аўтографам: «Мілым Ірыне і Мішы — з боскага цудоўнага Слоніма. — Уладзімір, 24.04.71.». Дзе яна цяпер — невядома.

Сяргей ЧЫГРЫН

Пра што хацеў сказаць аўтар

Мода, якая стала ўвайшла ў практыку айчынных творцаў, — змяшчаць пад вокладкай паэтычных зборнікаў побач з уласнымі і перакладныя творы. Да перакладчыцкай дзейнасці звяртаецца ўсё больш аўтараў, і, адпаведна, пашыраецца геаграфія абсягаў беларускіх твораў. Стала традыцыяй збіраць у адным выданні перастворaныя на вялікай колькасці моў нацыянальна значныя творы-маніфесты асобных аўтараў. Нядзіўна, што да пытанняў мастацкага перакладу звяртаецца ўсё больш навукоўцаў: наспела патрэба асэнсавання перакладчыцкай спадчыны і ўдасканалення тэарэтычнай базы перакладчыцкай дзейнасці.

Сёлета пабачыла свет і манаграфія Наталлі Якавенкі «Мастацкі пераклад з роднасных моў у гісторыі беларускай літаратуры», дзе ў кантэксце гісторыі айчыннага пісьменства раскрываюцца найбольш актуальныя пытанні мастацкага перакладу як складніка міжлітаратурных камунікацый і своеасаблівага віду літаратурна-мастацкай творчасці.

Мэтай даследавання было паказаць, што перакладная літаратура мае анталагічны статус. Магчыма, некаторым падаецца, што літаратурныя перастварэнні знаходзяцца быццам па-за літаратурным працэсам, але гэтае меркаванне памылковае. Яны ў вялікай колькасці прысутнічаюць у літаратурнай прасторы, а значыць, і ўплываюць на менталітэт і культуру, фарміраванне светапогляду: іх чытаюць, натхняюцца імі, робяць перайманні. Не рэдкасць і такія выпадкі, калі наяўнасць перакладнога твора дапамагае лепш зразумець, адчуць некаторыя тонкасці і нюансы ў творы на мове арыгінала (як прыклад — раман М. Булгакава «Майстар і Маргарыта» і яго перастварэнне па-беларуску).

Аўтар звяртаецца да высноў Умбэрта Эка, які распрацаваў канцэпцыю інтэртэкстуальнага дыялогу, сутнасць якога — феномен выяўлення і распазнавання ў новым тэксце папярэдніх, што выяўляюць сябе праз цытаванне, алюзіі, перайманні, пародыі, новыя варыянты першапачатковага тэксту, а часам нават і плагіят. Адметна, што знакаміты тэарэтык перакладу вызначыў парадаксальнаю і фенаменальнаю па сваёй сутнасці прыроду перастварэння: «І пры судакрананні з іншай мовай тэкст паказваў патэнцыялы тлумачэння, якія не былі вядомыя мне самому, і як часам пераклад мог палепшыць арыгінал (я кажу "палепшыць" менавіта ў дачыненні да таго намеру, які сам тэкст раптоўна выяўляў, незалежна ад таго зыходнага намеру, які быў у мяне як эмпірычнага аўтара)». Таму падчас перастварэння твора сродкамі іншай мовы ніколі не гаворыцца тое самае, што ў аўтарскім тэксце: перакладчык перадае «амаль тое самае». Як ні дзіўна, але вышэйсказанае слушна нават тады, калі робіцца аўтапераклад. Даследчыца праілюстравала сітуацыю на прыкладзе апавядання Максіма Багдановіча «Апокрыф». Паказальна, што ўжо ў назвах твора ёсць адрозненне — у перакладзе на рускую мову яна гучыць як «Притча о васильках».

Наталля Якавенка ці не ўпершыню шырока адзначыла (і патлумачыла з прывядзеннем прыкладаў) тое, пра што раней толькі згадвалі на перакладчыцкіх семінарах ды круглых сталах: значна больш праблем узнікае пры перакладзе тэкстаў менавіта на роднасныя мовы, чым пры перастварэннях на далёкія. Як прыклад — прыведзеныя ў даследаванні фрагменты перапіскі паэта Міхаіла Ісакоўскага з Аркадзем Куляшовым, калі першы працаваў над перакладам на рускую мову паэмы «Сцяг брыгады». Сэнс пытанняў, якія тычыліся перастварэння тэксту, палягаў у тым, што перакладчык сутыкаўся з праблемай адсутнасці адпаведнікаў у мове перакладу. Гэта распаўсюджаная сітуацыя: з якой і на якую мовы ні рабіліся б перастварэнні, той, хто іх робіць, заўжды сутыкаецца з падобнымі пытаннямі. Даследчыца адзначыла, што тут як рашэнне праблемы існуе варыянтнасць перакладу.

Крыніцамі даследавання паслужылі празаічныя і паэтычныя творы ў арыгіналах і перакладах на беларускай, рускай, украінскай і польскай мовах. Кола аўтараў вельмі шырокае. Адметнасцю работы з'яўляецца анкетаванне, уключанае аўтарам у дадатак да манаграфіі. Перакладчыкам былі прапанаваны анкеты па ўзоры з варыянтамі адказаў на пытанні. Так, сярод перакладчыкаў — і сталыя, хто даўно займаецца перастварэннямі, і маладзейшыя, якія спрабуюць сілы ў галіне мастацкага перакладу адносна нядаўна: Уладзімір Скарынкін, Ірына Багдановіч, Пятро Жаўняровіч і Алесь Емяльянаў-Шыловіч, Адам Шостак ды шмат іншых. Анкетаванне дазволіла зрабіць шэраг важных высноў.

Дарэчы, даследчыца азначыла новыя далягляды пошукаў у тэме. Як ужо было заўважана, практыка перакладчыцкіх спроб значна пашырылася за апошнія дзесяцігоддзі. Адной з прычын гэтага стала ўкараненне і шырокае распаўсюджанне анлайн-перакладчыкаў, што дае магчымасць рабіць перастварэнні без ведання і вывучэння мовы арыгінала. Але якія тэксты атрымліваюцца на выхадзе, які ў іх адсотак аўтарскай задумы і рэалій арыгінальных твораў — пытанне…

Яна БУДОВІЧ

СЛАВАЦКІ ДЫСКУРС

Асэнсаванне перакладаў Янкі Купалы

Апошнія дзесяцігоддзі найноўшай гісторыі Беларусі выразна пазначаны шматвектарнасцю інтарэсаў, імкненнем да актыўнага культурнага дыялогу. Сёння можна весці гаворку пра даволі значны перакладчыцкі набытак — як адной з форм на шляху да ўзаемнага спазнання, стымуляванай асабістымі знаёмствамі і кантактамі пісьменнікаў. Сваёй чаргі чакае аналітычнае асэнсаванне, узважанае навуковае бачанне здалёк і зблізку мінулага і сучаснага гісторыка-літаратурнага працэсу.

Верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?» з поўным правам можна назваць літаратурным маніфестам беларускага народа пачатку XX стагоддзя. Пра гэта сведчыць яго нацыянальны і міжнародны рэзананс, мастацкія пераклады, улучанасць у авангард грамадска-палітычнага жыцця мінулага часу, а таксама пачэсная дыпламатычная роля сёння.

З уласна мастацкага пункту гледжання, твор, упершыню апублікаваны ў зборніку «Жалейка» (С.-Пецярбург, 1908), уяўляе сабой вельмі рэдкі прыклад усходнеславянскага выкарыстання лагаэдычнага вершавання:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.

А што яны нясуць
на худых плячах,
На руках ў крыві, на нагах
у лапцях?
— Сваю крыўду.

А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю,
А куды ж нясуць на паказ сваю?
— На свет цэлы.

А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць наўчыў,
разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.

А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым,
глухім?
— Людзьмі звацца.

Цалкам прыводзім тэкст верша з прагматычнай мэтай змясціць побач арыгінал і два пераклады на славацкую мову, адзін з якіх зусім невядомы для даследчыкаў. Спаконвеку аўтар і перакладчык паэтычных твораў знаходзяцца ў стане своеасаблівага творчага спаборніцтва. А ў выпадку, калі арыгінал і пераклад «глядзяць» адзін аднаму ў вочы, сітуацыя творчага спаборніцтва/супрацьстаяння, па сутнасці, матэрыялізуецца. Пры гэтым для знаўцы абедзвюх моў адразу адкрываюцца магчымасці параўнання вобразнай сістэмы і моўных эквівалентаў, выяўлення сутнасці падвойнага «я» — аўтара і перакладчыка. Кваліфікаваныя спецыялісты падрыхтаваны ў Беларусі і Славакіі. Напрыклад, Белдзяржуніверсітэт ажыццявіў ужо некалькі выпускаў дыпламаваных філолагаў-славакістаў.

Міжнародную вядомасць і аўтарытэт твора Янкі Купалы ў свой час істотна падмацавала ўвага класіка рускай літаратуры Максіма Горкага. У часопісе «Современный мир» (1911, № 2) быў апублікаваны яго аб'ёмісты артыкул «Аб пісьменніках-самавучках», што змясціў аналіз звыш чатырохсот рукапісаў выхадцаў з народных мас шматнацыянальнай Расійскай імперыі. Высновы назіранняў М. Горкага паказальна суседнічаюць з факусаваннем увагі на беларускай літаратуры і перыядычным друку, уласным перакладам «красамоўнай і суровай песні» Янкі Купалы.

У біябібліяграфічным даведніку «Беларускія пісьменнікі» (1994, т. 3, с. 518) зафіксаваны тры пераклады вершаў Янкі Купалы на славацкую мову. Першыя два належаць пяру Юрая Андрычыка: «*Nie, nie som básnik*» («Я не паэта»), «*Kde si, brečtan, zimoval?*» («Дзе ты, хмелю, зімаваў?»). Дэталёвае вывучэнне гісторыі трэцяга вывела на свет ланцужок нечаканых звестак, вартых увасаблення ў дэтэктыўным сюжэце, што лішні раз пацвярджае неабходнасць працы па выяўленні, сістэматызацыі і даследаванні гісторыі перакладчыцкай дзейнасці, папулярызацыі беларускай літаратуры за мяжой.

Перад намі пераклад верша Янкі Купалы, надрукаваны ў славацкім эміграцкім часопісе «Horizont» (Мюнхен, 1983, № ½) за подпісам Мар'ян Жар *(Marián Žiar):*

Kto to tam ide? Kto svojím
nástupom
Ukázal cestu tak veľkým zástupom?
— Bielorusi.
A čože vlečú na chrbte zodratom,
V krvavých rukách a v kroku tak
chradnom?
— Svoje krivdy.
A kamže nesú tieto krivdy svoje,
Či niekto ich snáď za ne poľutuje?
— Pred celý svet.
Ktože im kázal vydať sa v šíry svet
So svojou krivdou za
právo zahorieť?
— Bieda, psota.
Po čom že túžia takto ponížení,
Keď hluchým, slepým
spravili všetkých z nich?
— Žiť jak človek.

Пры звароце да найноўшых крыніц па гісторыі нацыянальнага пісьменства ўдалося высветліць наступнае. Мар'ян Жар — гэта псеўданім, за якім стаіць вядомы дзеяч эміграцыі Імрых Кружляк (*Imrych Kružliak,* 1916—2019), публіцыст, прадстаўнік «каталіцкай мадэрны» ў славацкай паэзіі. На радзіме кар'ерны рост колішняга выпускніка філасофскага факультэта Універсітэта Я. А. Коменскага (Браціслава) быў звязаны з адказнымі пасадамі ў дзяржаўнай сістэме інфармацыі і друку. З 1949 года Імрых Кружляк у эміграцыі (Аўстрыя, Германія), працяглы час працаваў на радыёстанцыі «Свабодная Еўропа» (Мюнхен). З 1972-га — шэф-рэдактар часопіса «*Horizont*», з 1987-га — старшыня Саюза славацкіх пісьменнікаў і мастакоў у эміграцыі. Пасля «аксамітнай» рэвалюцыі ў Чэхаславакіі, падзелу краіны на дзве самастойныя дзяржавы быў дарадцам прэзідэнта Славацкай Рэспублікі Міхала Ковача.

Названы пераклад М. Жара быў апублікаваны ў год выхаду вехавага ў гісторыі ўшанавання спадчыны Янкі Купалы зборніка «А хто там ідзе?» (1983), укладзенага Вячаславам Рагойшам і Ядвігай Раманоўскай, у якім хрэстаматыйны верш песняра прагучаў на 82 мовах свету. Славацкая мова ў гэтым выданні прадстаўлена не была.

Падчас рэтраспектыўнага даследавання ўжо сама фіксацыя ў даведніку «Беларускія пісьменнікі» перакладу М. Жара не можа не здзіўляць, выклікае заканамерныя пытанні. Праца над біябібліяграфічным выданнем пачалася яшчэ ў савецкі час, калі існавала «жалезная заслона», моцнае ідэалагічнае размежаванне паміж СССР і краінамі капіталістычнага Захаду. У гэтым супрацьстаянні і «Свабодная Еўропа», і «*Horizont*» былі ў шэрагу т. зв. варожых галасоў. Цяжка дапусціць, што перад складальнікамі ставілася задача і наогул былі магчымасці для вывучэння замежнага, забароненага ў СССР, друку. Праўды дзеля трэба адзначыць, што Еўропа і ўвесь свет у канцы 1980-х – пачатку 1990-х пачалі кардынальна мяняцца, але інерцыя ідэалагічнай пільнасці пры падрыхтоўцы выданняў падобнага фармату ўсё ж дзейнічала.

Прэцэдэнт публікацыі беларускага верша на старонках эміграцкага выдання з выразным антысавецкім стаўленнем парушае наша звыклае ўяўленне пра ролю перакладу ў гісторыі культуры Беларусі, міжнародных стасункаў як выключна дыпламатычнага жэста або мастацкай візітоўкі адметнай нацыянальнай традыцыі. Пераклад Купалавага твора быў змешчаны на адной старонцы з востра палітычнымі публікацыямі пад агульнай назвай «Еўрапейскі патруль», дзе аб'ектамі крытыкі былі найперш знешняя і ўнутраная палітыка Савецкага Саюза, сістэмнае парушэнне ім правоў чалавека: «Цені пасля Брэжнева», «Вытворчасць рабоў», «Хто такі Андропаў?» і інш. Верш «А хто там ідзе?» прадстаўлены ў адной калонцы з артыкулам «Савецкая русіфікацыя», а таму выканаў своеасаблівую ангажаваную ролю мастацка-публіцыстычнай ілюстрацыі гатоўнасці народа да супраціву гэтай палітыцы.

Вынікі славацкага напрамку даследаванняў аўтара гэтых радкоў былі апублікаваны ў некалькіх артыкулах апошніх гадоў, што пабачылі свет у Беларусі і Славакіі, а таксама далі фактаграфічную аснову для артыкула Мар'яна Серваткі «Аб адным вершы» («*Literárny týždenník*», 2018, № 17/18), у якім тэзісна былі ахарактарызаваны славацка-беларускія культурныя праекты апошніх гадоў, а пры звароце да верша Янкі Купалы зроблены акцэнт на перакладзе Максіма Горкага, што чарговы раз наглядна пацвярджае актуальнасць ідэйных арыенціраў і культурнага пасрэдніцтва мінулага часу.

У 2018 годзе пабачыла свет новае выданне зборніка «А хто там ідзе?» (укладальнікі Вячаслаў Рагойша і Алена Ляшковіч), у якім праграмны твор Янкі Купалы прадстаўлены ўжо на 101 мове свету. У гэтай кнізе рэпрэзентаваны і пераклад на славацкую мову, выкананы былым паслом Славакіі ў Беларусі Мар'янам Серваткам:

Ktože to tam ide, ktože to tam
kráča
v tom obrovskom húfe?
— Bielorusi.
A čože to nesú na
vychudnutých pleciach,
na mozoľnatých rukách,
na nohách v onuciach?
— Krivdu svoju.
A kamže nesú onú
krivdu veliku,
a kamže ju nesú ukázať?

Tieňe po Brežnevovi
Poľský maják
Plynové otrokov
Cena a poľská revólia
európska hliadka
Kto je Andropov?
Sovietska realitárka
Kto to tam ide?

Старонка часопіса «Horizont» (1983, № ½) з вершам Янкі Купалы «А хто там ідзе?».

— Svetu celému.
A ktože ich, už nie jeden milión,
krivdu niesť naučil, zo spánku
prebudil?
— Nešťastie, bieda.
A čohože, čoho zachcelo sa im,
vekmi pohŕdaným, im slepým
a hluchým?
— Aby ich ľuďmi zvali.

У даведачным апараце зборніка ў якасці крыніцы гэтага перакладу ўказана кніга выбраных вершаў Янкі Купалы ў перакладах на славацкую мову — «А хто там ідзе?» *(«Ktože to tam ide?»)* (Браціслава, 2017), падрыхтаваная пад эгідай Саюза славацкіх пісьменікаў спецыяльна да 135-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры. На нашу думку, менавіта гэтае выданне можа стаць знакавым у замежнай купаліяне, паколькі яно створана ў актуальным рэчышчы пазбаўлення ад стэрэатыпаў, абнаўлення гуманітарнай свядомасці і міжкультурнага дыялогу.

Ініцыятарам падрыхтоўчай працы і выхаду вершаў Янкі Купалы ў перакладзе на славацкую мову быў Мар'ян Серватка, які ажыццявіў падбор твораў, напісаў прадмову «Малая лабараторыя дыялогу культур». Над перакладамі таксама працавалі вядомыя літаратары – Яраслаў Рэзнік *(Jaroslav Rezník)* і Сяргей Макара *(Sergej Makara)*. Зачынны верш «А хто там ідзе?» у перакладзе М. Серваткі стаў адмысловым эпіграфам, камертонам, даў назву ўсяму зборніку, куды ўвайшлі 37 класічных твораў беларускага песняра, прадстаўленыя ў трох тэматычных



Зборнік вершаў Янкі Купалы «А хто там ідзе?» ў перакладзе на славацкую мову. Браціслава, 2017.

раздзелах, якія ачолілі купалаўскія загалоўкі і паэтычныя радкі: «А keď sa niekto spýta» («А калі нехта спытаецца»), «*Sťa sama cárovná*» («Як сама царыца»), «*Matka a syn*» («Маці і сын»). Славацкія чытачы маюць магчымасць пазнаёміцца з шэдэўрамі беларускай класікі — вершамі «Мая малітва», «Спадчына», «Я не паэта…», «Родныя песні», «Явар і каліна», «Яшчэ прыйдзе вясна», «З кутка жаданняў» ды інш.

Дзеля ўзнаўлення ўсёй публікацыйнай гісторыі адзначым, што на час выхаду названай кнігі пераклад М. Серваткі ўжо быў надрукаваны, прытым некалькі разоў. Першая яго публікацыя пабачыла свет на старонках беларускага навуковага і метадычнага часопіса «Роднае слова» (2013, № 10) і была ўключана ў артыкул аўтара гэтых радкоў — «Грані дыпламатычных місій Мар'яна Сэрваткі», задуманага як адмысловы знак удзячнасці перакладчыку ў сувязі са сканчэннем яго дыпламатычнай місіі ў Беларусі. Тут жа была размешчана падборка вершаў самога спадара пасла ў нашай інтэрпрэтацыі.

Другі раз пераклад М. Серваткі быў апублікаваны ўжо ў Славакіі, у газеце «*Literárny týždenník*» (2015, № 23/24), побач з яшчэ адным знакавым вершам Янкі Купалы — «Мая малітва» *(«Moja modlitba»)*. А ў Беларусі мастацкая інтэрпрэтацыя М. Серваткі паўторана ў 2018-м, у дадатку да другога тома энцыклапедыі «Янка Купала», у суседстве з усімі мастацкімі інтэрпрэтацыямі толькі што выдадзенага зборніка «А хто там ідзе?».

Наяўнасць некалькіх перакладаў і публікацый аднаго з ключавых твораў Янкі Купалы на славацкую мову, газетны і кніжны фарматы іх выдання прадвызначылі фарміраванне новага літаратуразнаўчага і культуралагічнага дыскурсу, беспрэцэдэнтнага не толькі ў гісторыі славацка-беларускіх сувязей, але і ў больш шырокім кантэксце міжнародных культурных узаемаадносін.

Мікола ТРУС

Па старонках

Партрэт Кшыштафа Весялоўскага.

Складана назваць установу культуры, якая б для ўзбагачэння нацыі і папулярызацыі на міжнародным узроўні гістарычных і сучасных каштоўнасцей беларусаў рабіла больш. У віншаванні, накіраваным калектыву Нацыянальнага мастацкага музея, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назваў галоўны дом беларускага мастацтва скарбніцай духоўнай культуры краіны. І сёння Нацыянальны мастацкі, бясспрэчна, — эталон для многіх музеяў не толькі Беларусі, але і свету.

З фондавых экспанатаў у музеі можна ўбачыць толькі тры працэнты твораў. Таму праз некалькі гадоў у Мінску з'явіцца Музейны квартал, які будзе уяўляць сабой цэлы комплекс Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі і аб'яднае чатыры будынкі: Кірава, 25; Леніна, 20; Леніна, 22; Карла Маркса, 24. Апошні далучылі да квартала ў 2014-м.

Работы па стварэнні квартала вядуцца з 2010 года. Справа рэалізоўвалася павольна — па меры паступлення фінансавання. Але падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» кіраўнік дзяржавы даручыў паскорыць будаўніцтва. Па словах генеральнага дырэктара мастацкага музея Уладзіміра Пракапцова, першую чаргу будаўніцтва спадзяюцца завяршыць ужо ў 2020 годзе.

Зараз музей — гэта вялікая платформа, дзе можна рэалізоўваць разнастайныя праекты. Але ж не трэба забываць, што ў гэтага будынка вялікая і багатая гісторыя, якая не сціраецца часам, а, наадварот, дзякуючы дзейнасці супрацоўнікаў захоўваецца і застаецца вечнай. Навуковы супрацоўнік аддзела навукова-асветніцкай работы Нацыянальнага мастацкага музея Надзея Усава, якая нямала гадоў прысвяціла працы ў музеі, расказала карэспандэнту «ЛіМа» 5 невядомых гісторый, звязаных з галоўнай культурнай скарбніцай краіны. Яны наглядна дэманструюць, што ў жыцці не бывае нічога выпадковага.

ПАЧАТАК

— Гэтая гісторыя звязана з першым дырэктарам Нацыянальнага мастацкага музея Мікалаем Пракопавічам Міхалапам (узначальваў музей з 1939 па 1941 год). Памятаю, калі толькі прыйшла ў музей працаваць, праводзячы экскурсію, мы пачыналі заўсёды з 1944 года, калі дырэктарам стала Алена Аладава. Мікалая Пракопавіча не згадвалі. Потым ад старэйшых супрацоўнікаў я даведалася: музей быў створаны ў 1939 годзе. Гісторыя будынка тады не была апісана зусім. Фактычна мы яе прапісалі ў апошнія гады, пачынаючы з 2000-х.

У свой час паміж Мікалаем Міхалапам і Аленай Аладавай узнік канфлікт. Гэтыя два кіраўнікі адзін аднаго не зразумелі. Маладая Алена Васільеўна працавала ў Карціннай галерэі Мінска. Калі пачалася вайна, музейшчыкі чакалі загад аб эвакуацыі. Загад не паступаў, тады самі пачалі пакаваць рэчы. Чакалі, калі прыедуць грузавікі, каб вывозіць экспанаты. Але ўсе грузавікі былі накіраваны на партыйныя архівы. Панавала паніка, людзі беглі. Вядома, не да музея. Тады Аладава і Міхалап пагрузілі самае каштоўнае ў скрыні і схавалі іх разам са слуцкімі паясамі (якіх было 48) у сцірты для дроў.

Калі Мінск пачалі бамбіць, зразумелі: справа зацягваецца. Горад гарэў. Стала відавочна, што з Мінска трэба бегчы: было небяспечна. Думалі, што рабіць з музеем і як быць. Параіўшыся, вырашылі закрыць яго на ключ. Накіраваліся ў Калодзішчы. Селі там на платформу, якую пачалі бамбіць. Аладава саскочыла і схавалася ў лесе. Дайшла да Магілёва. Адтуль была эвакуіравана ў Саратаў з сям'ёй. Міхалап застаўся на платформе. Але Алена Васільеўна падумала, што сям'я Міхалапа саскочыла з цягніка, ён застаўся ў Мінску і выдаў немцам схаваныя скрыні.

Калі Алена Васільеўна вярнулася ў Мінск у 1944 годзе, нічога ў схованцы не было. Людзі расцягнулі дровы. Яна вырашыла, што ва ўсім вінаваты Мікалай Пракопавіч, бо не змог як дырэктар наладзіць эвакуацыю. Таму ні аднаго твора Мікалая Міхалапа ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея пасля не было.

Ён быў графікам і мастаком-керамістам. У музей не прыходзіў. Пасля 1944 года стаў працаваць у Архітэктурна-праектным інстытуце, займаўся будаўніцтвам Мінскага фаянсавага завода. Такім чынам, Алена Аладава і Мікалай Міхалап не перасякаліся.

У пэўны перыяд калектыў музея быў збянтэжаны, мы хацелі знайсці работы Міхалапа, каб змясціць у музеі. Знайшлі нашчадкаў, у іх былі простыя керамічныя работы. Яго творы засталіся толькі на Мінскім фаянсавым заводзе, які ўжо стаў банкрутам, і ў суседнім Нацыянальным гістарычным музеі, якому аўтар прадаваў і дарыў свае работы.

Уладзімір Іванавіч Пракапцоў пайшоў да дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея і папрасіў паказаць творы Міхалапа. У іх была ваза «Бульба». У гістарычным яна заўсёды захоўвалася ў запасніках. Уладзімір Іванавіч сказаў дырэктару: «Навошта вам гэтая ваза, якую вы ніколі не выстаўляеце? Дайце нам, мы яе ў экспазіцыю паставім». Спачатку музей супраціўляўся. Але па загадзе Міністэрства культуры вазу ўсё ж перадалі Нацыянальнаму мастацкаму музею, дзе яна цяпер і выстаўлена.

Гісторыю гэтую мала хто ведае, але важна, што сёння творы першага дырэктара ёсць у музеі. Гэта гістарычная справядлівасць праз гады. Раней у музеі былі толькі бюсты Алены Аладавай і Юрыя Карачуна, а Уладзімір Пракапцоў замовіў яшчэ і бюст Мікалая Міхалапа скульптару Святлане Гарбуновай, якая зрабіла яго па фатаграфіях. Цяпер у нас тры партрэты дырэктара. Мы гэтым ганарымся. Дарэчы, у Нацыянальным мастацкім за 80 гадоў змянілася толькі чатыры дырэктары.

УПЭЎНЕНАСЦЬ

— Менавіта Алена Аладава з яе бязмежнай энергіяй умела рабіць музей сапраўдным цэнтрам культуры. У 50-я гады рынак карцін быў вельмі хісткі, Алена Васільеўна змагла зрабіць так, што ў нашай краіны з'явіўся цудоўны музей. Яна ўмела набываць карціны, была цэнтрам мастацкіх варункаў.

Таму другая мая гісторыя звязана з Аленай Васільеўнай і трыма партрэтамі: Марыяны Весялоўскі, Кшыштафа Весялоўскага і іх прыёмнай дачкі Грызельды Сапегі. Грызельда памерла, калі ёй было 19 гадоў. Яе прыёмныя бацькі гаравалі: выгадавалі дзяўчынку, і яна так рана пайшла з жыцця. Вырашылі ў гонар яе пабудаваць касцёл у Гродне. Замовілі фундатарскія партрэты ўсёй сям'і.

Пасля вайны, калі Алена Аладава збірала калекцыю, стала шукаць гэтыя партрэты. Прачытала інвентары, паехалі ў Брыгіцкі касцёл у Гродна. Паглядзелі ўсё, знайшлі разьбы, скульптуры, фрэскі, але партрэтаў не было.

Алена Васільеўна не магла супакоіцца. Вырашыла паехаць другі раз. Аблазіла гарышча, нічога не знайшла. У касцёле быў склеп, які з часам завалілі смеццем. Яго ўжо спрабавалі пачысціць, але аднаго з супрацоўнікаў касцёла ўкусіў шалёны пацук. З тых часоў туды ніхто не спускаўся.

Аладава, даведаўшыся, што ёсць склеп, папрасіла, каб яе туды адвялі. Узяла рыдлёўку (паехала ў Гродна з галоўным захавальнікам Пятром Герасімовічам, у якога пасля фронту была адна рука) і пачала разграбаць смецце. Праз некаторы час натрапіла на ўваходныя дзверы ў склеп. Узрадавалася: зразумела, што ніхто туды не заходзіў.

Дзверы знайшлі, але праход быў вельмі малы. Яна туды ў літаральным сэнсе пралазіла. Хоць сама Алена Васільеўна была маладой маці, паслаць туды галоўнага захавальніка з адной рукой не магла, таму ўсё зрабіла сама. Там і знайшла партрэты, якія знаходзіліся ў страшным стане. Гэта была сапраўдная перамога, якая стала гісторыяй не на адно стагоддзе. Усе работы Аладава прывезла ў Мінск і адправіла на рэстаўрацыю. Імі займаліся каля 15 гадоў. У выніку наш музей мае ў сваёй калекцыі тры выдатныя партрэты. Гэта не проста гісторыі Аладавай або Нацыянальнага мастацкага. Такія факты паказваюць, наколькі прафесія музейшчыка можа быць цяжкай і небяспечнай.

БУДЫНАК

— Наш будынак, безумоўна, унікальны. Ён быў спецыяльна спраектаваны для музея. Даручылі яго архітэктару, які не меў вышэйшай архітэктурнай адукацыі, франтавіку Міхаілу Бакланаву. Яго апякаў у той час Іосіф Лангбард. Яны разам зрабілі кінатэатр «Перамога», і Бакланаў зразумеў, што пад кіраўніцтвам Лангбарда зможа стварыць мастацкі музей.

Бакланаў першапачаткова спраектаваў музей у іншым месцы: хацеў, каб гэта быў сапраўдны храм мастацтва. Галоўны архітэктар не згадзіўся. Настойваў, каб будынак музея быў блізка да праспекта Незалежнасці. Прыбудову да будынка Міністэрства замежных спраў з фантанамі, тэрасамі не зразумеў.

У выніку Бакланаў зрабіў нам фасад брутальны, мужны, з вялікімі калонамі. Меркавалі яшчэ пусціць фрыз, але на яго не хапіла грошай. На дварэ 1957 год. Барацьба з празмернасцямі. Бакланаў вырашыў, што звонку гэта будзе храм, але ўнутры зробіць усё больш сціпла. Там, на яго думку, патрэбна нешта паэтычна ўзвышанае. Менавіта тады быў спраектаваны інтэр'ер вестыбюля. Але ён нагадваў інтэр'ер вестыбюля Адміралцейства, зроблены Захаравым. Калі паглядзець на фотаздымкі, не адразу можна знайсці адрозненні.

Калі Бакланаў спраектаваў гэты прыгожы, лёгкі вестыбюль, прыйшла каманда прыёмшчыкаў і сказала: «Нейкі ён у вас не савецкі атрымліваецца». Папрасілі гэтую савецкасць перадаць у архітэктуры нейкім чынам. І тады (мы толькі нядаўна заўважылі) ён вырашыў вестыбюль упрыгожыць пяціканцовымі зорачкамі. Іх складана ўбачыць. Нядаўна адна з зорак адарвалася і ўпала. Тады мы ўбачылі, як выглядаюць зблізку гэтыя легендарныя зоркі.



Генрых Семірадскі «Давер Аляксандра Македонскага лекару Філіпу», 1870.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

гісторыі

КАРЦІНА

— У нас пастаянна экспануецца карціна Генрыха Семірадскага. Алена Аладава аднойчы расказала гісторыю, звязаную з набыццём гэтай карціны. Яна ніколі не была зацікаўлена ў тым, каб Семірадскі быў прадстаўлены ў нашым музеі.

У адной з народных артыстак СССР у Маскве яна знайшла дыпломную працу Васілія Сурыкава. Перад набыццём палатно трэба было ацаніць на камісіі ў Траццякоўскай галерэі. У той час камісію ўзначальваў Уладзімір Кеменаў, які пісаў доктарскую дысертацыю па Сурыкаву. Ён адмовіў Аладавай у тым, каб работу Сурыкава павезлі ў Мінск. Палатно засталося ў Траццякоўскай галерэі.

Надзея Лежэ «Супрэматызм № 1. Кампазіцыя з чорным кругам і чырвоным трохвугольнікам на белым фоне».

Аладава была абураная. Доўга сварылася з камісіяй. Але Кеменаў уладальніцы карціны заплаціў больш. Наўзамен ёй аддалі твор антаганіста Сурыкава — Генрыха Семірадскага, забытага мастака акадэмічнага плана. Аладава прыняла гэтую работу, але засталася незадаволеная сітуацыяй, бо на палатно Сурыкава палявала доўга. Семірадскага не вельмі любіла.

Прайшло некалькі дзясяткаў гадоў. І знайшліся новыя факты ў біяграфіі Семірадскага. Ён нарадзіўся ў Харкаве, але яго бацькі — у Навагрудскай губерні. Цётка яго была аўтарам знакамітай кнігі «Гаспадыня Літоўская». Аказваецца, Семірадскі часта прыязджаў пад Мінск і тут жа знайшоў сваё каханне — стрыечную сястру. Ажаніўся з ёй. Пасля з жонкай з'ехаў у Італію, дзе адкрыў майстэрню, разбагацеў і пабудаваў там мармуровы палац. Па кошце яго работы потым перавышалі творы Сурыкава.

Атрымалася так, што, хоць Генрых Семірадскі лічыцца польскім мастаком, ён нам не чужы. Карані яго адсюль. Тут ён зрабіў некалькі фотаздымкаў і малюнкаў. Гэта якраз той мастак, які мае дачыненне да беларускай гісторыі. Атрымалася, Аладава ўзяла карціну, яшчэ не разумеючы, што гэты чалавек мае дачыненне да Беларусі.

ГАБЕЛЕН СТАГОДДЗЯ

— Габелен стагоддзя — самы вялікі экспанат, які не можа захоўвацца ў нашым музеі, таму што нам належыць толькі трэцяя яго частка. Гэты габелен Аляксандр Кішчанка рабіў на сродкі спонсараў.

Калі габелен не змаглі прадаць, яго трэба было акупіць. Паўстала пытанне закупкі. На дварэ — 90-я. Грошай у дзяржавы не было. І доўгі час габелен ляжаў проста ў майстэрні мастака. А яго трэба было час ад часу разгортваць, праветрываць. Таму ўдава аўтара перадала габелен на Барысаўскі камбінат, дзе ёсць вялізныя цэхі.

Праз гады паўстала пытанне аб наданні габелену статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Так і адбылося. Таму сёння вывезці габелен для продажу без дазволу Міністэрства культуры ніхто не можа.

Я памятаю, як мы арганізоўвалі камісію з вядучых мастакоў нашай краіны, паехалі глядзець габелен на Барысаўскі камбінат. Была пастаўлена ўмова: габелен не можа належаць толькі сям'і. Тады было прынята рашэнне падзяліць яго на тры часткі: адна належыць спонсарам, другая — сям'і, трэцяя — музею. Мы забралі верхнюю частку. Вядома, ніхто не будзе рэзаць твор мастацтва, але мы ведаем, што яго вярхушка — гэта спадчына ўсёй Беларусі.

За гэты час у Мінску было ўзведзена мноства будынкаў, якія б сталі выдатным масцам для габелена: Нацыянальная бібліятэка, буйныя гасцініцы, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны... Сёння гэты габелен нідзе не прапісаны. Хоць для яго проста патрэбна асобная зала. Атрымліваецца, што габелен-прывід не можа знайсці сабе месца. Ён ацэнены ў 1 мільён 750 тысяч долараў. Гэта ўнікальны твор. Барысаўскі камбінат не можа такі саткаць. З кожным годам кошт габелена расце.

Фота зпрадастаўлена Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь.

Надзя Лежэ з міністрам культуры БССР Юрыем Міхневічам і Аленай Аладавай. 1967 г.

НЕЗАБЫЎНАЯ НАДЗЯ

Беларуска Надзея Хадасевіч-Лежэ была прадстаўніцай авангарда і цвёрдай камуністкай, удзельніцай французскага супраціву ў гады Другой сусветнай і сяброўкай савецкага міністра культуры Кацярыны Фурцавай. Яна дапамагла прывезці ў СССР «Мону Лізу» і перадала ў Мінск творы мастацтва на сотні тысяч долараў (у тым ліку керамічныя работы Пікаса). Яе называлі феноменам беларускай культуры. Нядаўна ў Нацыянальным мастацкім музеі адкрыўся міжнародны выставачны праект «Надзя. Да 115-годдзя з дня нараджэння Надзеі Хадасевіч», у якім прадстаўлены экспанаты з прыватных калекцый Францыі і фондаў Нацыянальнага мастацкага.

Ураджэнка Віцебшчыны Надзея Хадасевіч-Лежэ вядомая і як мастачка з рознабаковым дарам (станковы жывапіс, графіка, мазаіка), і як жонка і папулярызатар творчасці аднаго з найбуйнейшых мастакоў Францыі першай паловы XX стагоддзя Фернана Лежэ. Надзя Лежэ выступала ініцыятарам і арганізатарам выставак савецкіх мастакоў у Францыі, аказвала падтрымку суайчыннікам. Наведаўшы ў 1960-я — пачатку 1970-х гадоў Савецкі Саюз (у тым ліку і сваю родную Беларусь), яна падарыла музеям мноства бясцэнных прадметаў мастацтва. Так, Нацыянальны мастацкі музей Беларусі атрымаў ад яе ў якасці дару 360 факсімільных рэпрадукцый з карцін вядомых еўрапейскіх майстроў. Таксама Надзея Хадасевіч падарыла музею шэраг сваіх графічных твораў і работ Фернана Лежэ.

Выставачны праект «Надзя. Да 115-годдзя з дня нараджэння Надзеі Хадасевіч» стаў маштабнай культурнай падзеяй, якая знаёміць беларускага гледача як з творчасцю вядомай мастачкі, так і з яе падзвіжніцкай дзейнасцю ў сферы папулярызацыі сусветнага мастацтва. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 50 твораў (жывапіс, гуашы, малюнкі, літаграфіі і шаўкаграфіі) з французскіх прыватных сховаў, у тым ліку спадчыннікаў мастачкі.

Надзея Лежэ «Кампазіцыя з лялькай і кнігамі».

Куратар выстаўкі Святлана Пракоп'ева адзначыла, што задача міжнароднага праекта — максімальна поўна і шырока прадставіць творчасць майстра.

— Надзея Пятроўна звярталася да розных стылявых напрамкаў. Можна прасачыць яе творчы шлях ад ранніх работ, звязаных з супрэматызмам, праз кубізм, пурызм, сацрэалізм. Па сведчаннях спадчыннікаў, ёю былі створаны і перададзены ў СССР 82 мазаічныя пано. Спецыяльна да гэтай выстаўкі мной была праведзена даследчая работа і выяўлена месца знаходжання толькі 29 мазаік, шэсць з іх — у Зембіне. На жаль, некаторых ужо не існуе. Гэтая выстаўка павінна стаць адкрыццём: яна ўпершыню прадстаўляе жывапіс і графіку мастачкі ад 20-х да 80-х гадоў XX стагоддзя.

У наш час захаваліся звесткі пра тое, што звязвала Надзею Хадасевіч-Лежэ і Пабла Пікаса. Яна апісвала, што кансультавалася ў яго, а ён кансультаваўся ў яе. Вядома, што Пікаса прадставіў свае творы на знакамітую выстаўку-продаж, якую Надзея Хадасевіч арганізавала ў 1945 годзе ў дапамогу ваеннапалонным і пацярпелым у гады Вялікай Айчыннай вайны савецкім грамадзянам. Майстар бязвыплатна прадаставіў свае творы, і яны былі прададзеныя. Цікавы і той факт, што па эскізах Надзеі Хадасевіч-Лежэ вядомы куцюр'е П'ер Кардэн стварыў брошкі з каштоўных металаў, інкруставаных камянямі.

Надзея Хадасевіч-Лежэ спрабавала свае сілы ў розных мастацкіх кірунках, таму кожны наведвальнік выстаўкі знойдзе работу па душы. Напрыклад, у «"Дынамізме" на аранжавым фоне» і «Руху ў двух кірунках» немагчыма не адчуць узлёт і творчы парыў.

— Выстава цікавая шырокаму колу. Нават нічога не ведаючы пра мастачку, можна скласці яе паўнавартасны вобраз, — патлумачыла Святлана Пракоп'ева. — Тут прадстаўлена максімальна пашыраная біяграфія Надзеі Хадасевіч-Лежэ. Усе раздзелы выстаўкі маюць дадатковую інфармацыю, якая дазваляе зразумець знакавыя творы ў яе творчасці. Ёсць дзве відэазоны: першая ўяўляе прэзентацыю, прысвечаную мазаічным пано Надзеі Пятроўны, другая транслюе дакументальны фільм пра яе. А яшчэ — інтэрактыўная зона, дзе можна з дапамогай магнітнай дошкі і фігур стварыць сваю супрэматычную кампазіцыю.

15-гадовай дзяўчынкай Надзя выпадкова прачытала ў газеце, што ў адной са смаленскіх школ арганізавана мастацкая студыя, і рашуча накіравалася туды. Так яна трапіла да Уладзіслава Стржэмінскага і Кацярыны Кобра, знакамітых настаўнікаў-супрэматыстаў, і пачала ствараць супрэматычныя кампазіцыі. Вучылася Лежэ нядоўга: правяла ў смаленскай школе ўсяго два гады.

Як магла Надзя Лежэ, не маючы дастатковай адукацыі, дамагчыся такіх поспехаў у супрэматызме, застаецца загадкай. Але яна сама дае нам падказку: ёй часта дапамагалі беларускія арнаменты ручнікоў. Беларускія ткачыхі ўвасабляюць такія чорныя і чырвоныя фігуры (да таго ж добрай ткачыхай была яе маці).

Лежэ казала, што гэта дазваляла ёй нармальна ўспрымаць вельмі складаную тэорыю Стржэмінскага, якая ідзе ад Малевіча. Надзея ўспрымала філасофію Казіміра Малевіча выключна з пункту гледжання сялянкі, але была надзвычай здольнай.

Выстаўка мастачкі атрымалася экспрэсіўнай і пазвальнай. Тут шмат варыятыўнасці, пазнання, інтэрактыву.

Вікторыя АСКЕРА

млын навін

* * *

Сустрэча з вядомым медыцынскім публіцыстам і псіхатэрапеўтам Андрэем Курпатавым прайшла ў сталічнай кнігарні «Светач», якая зусім нядаўна была рэканструявана. Абодва паверхі гандлёвай залы былі напоўнены гараджанамі — чытачамі і пакупнікамі. Андрэй Курпатаў — расійскі ўрач-псіхатэрапеўт, прэзідэнт Вышэйшай школы метадалогіі, навуковы кіраўнік Лабараторыі нейранавук і паводзін чалавека Ашчаднага банка. Аўтар больш як 100 навуковых работ, 30 навукова-папулярных кніг і 12 манаграфій па псіхалогіі, псіхатэрапіі, філасофіі і метадалогіі. Агульны наклад яго кніг — звыш 5 млн экзэмпляраў! На прэзентацыі ў «Светачы» прадставілі серыю бестселераў Андрэя Курпатава «Акадэмія сэнсаў», у якой аўтар адкрывае сакрэты мозга, паводзін чалавека, дае дакладныя інструкцыі пра тое, як дамагчыся эфектыўнасці мыслення. Варта зазначыць, што на прэзентацыі ў «Светачы» ў адзін толькі дзень сустрэчы з Андрэем Курпатавым было прададзена больш як 150 экзэмпляраў яго кніг.

Сяргей ШЫЧКО

* * *

Анатоль Зэкаў скончыў Патапаўскую сярэднюю школу Буда-Кашалёўскага раёна амаль паўвека таму. Прыязджаючы на радзіму, ён заўжды сустракаецца з вучнямі і настаўнікамі, знаёміць іх з новымі кнігамі і вершамі. І вось творца зноўку наведаў родную школу. Падчас сустрэчы ў школе, якую арганізавала настаўніца беларускай мовы і літаратуры Любоў Янчанка, гучалі ранейшыя і свежыя творы паэта. У большасці з іх згадваліся знаёмыя слухачам назвы вёсак і вуліц, прозвішчы, імёны і нават мянушкі канкрэтных людзей, што жылі, а некаторыя яшчэ і цяпер жывуць побач. Атрымалася своеасаблівая справаздача паэта ў Год малой радзімы на роднай зямлі.

Мікіта БЯРНАЦКІ

* * *

Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка далучылася да міжнароднага праекта «Тыдзень літаратуры краін Паўночнай Еўропы», які ладзіць Канфедэрацыя паўночнаеўрапейскіх асацыяцый. У межах праекта прайшлі чытанні ўголас урыўкаў з кніг, аб'яднаных тэмай «Нардычнае свята». Старшакласнікі СШ № 7 разам з бібліятэкарам Наталляй Ефціфеевай прадставілі твор Юстэйна Гордэра «Сафіін свет», а пяцікласнікі — кнігу Астрыд Ліндгрэн «Піпі Доўгаяпанчоха». Дарослых, якія бралі ўдзел у праекце, пазнаёмілі з выданнем Карэн Бліксэн «Баляванне Бабет». Падчас чытанняў слухачы ўдзельнічалі ў віктарыне па літаратуры і геаграфіі краін Паўночнай Еўропы. За ўдзел у праекце Кобрынская ЦРБ узнагароджана дыпломам Цэнтра шведскіх даследаванняў.

Наталля КАНДРАШУК

* * *

«Бібліятэчнае краязнаўства — тэрыторыя вялікіх магчымасцяў» — пад такою назваю ладзіўся семінар для бібліятэкараў Ганцавіцкага раёна. Пра цікавыя звычаі продкаў у пакоі «Хата з матчынай душой» распавяла бібліятэкар раённай дзіцячай кніжніцы Валянціна Марыняк. Супрацоўнікі Раздзялавіцкай сельскай бібліятэкі пазнаёмілі з традыцыяй выпякання вясельнага каравая, якім славіцца гэтая зямля. Цікавы момант семінара — наведванне раённага Дома рамёстваў, дзе запрасілі на майстар-клас па выцінанцы. У вёсцы Будча пры сельскім клубе дзейнічае невялічкі музей, які быў адкрыты падчас святкавання 500-годдзя вёскі. Шмат экспанатаў для яго сабраў у свой час краязнаўца Фёдар Карпеня. І справа, якой ён аддаў частку жыцця, жыве. Шмат матэрыялаў ён пакінуў і для сельскай бібліятэкі. Сёння іх можна ўбачыць на паліцах краязнаўчага цэнтра «Радзімы край: слаўная памяць вякоў». У кніжніцы прайшоў вечар памяці, прысвечаны Фёдару Карпені.

Таццяна МАЛЯЎКА

* * *

Дзіцячыя часопісы са збору Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага заказніка канца XIX — пачатку XX ст. і дзіцячыя часопісы 1960—2000 гг. прадстаўлены на выстаўцы ў Дзіцячым музеі г. Полацка. Дарэчы, прэса для юнага чытача пачалася з часопіса. Да рэвалюцыі, у асноўным у Пецярбургу і Маскве, выдавалася каля 300 дзіцячых і юнацкіх часопісаў. У кожным нумары — казкі, апавяданні, вершы, біяграфіі знакамітых асоб, прыродазнаўчыя нарысы, друкаваліся Аляксандр Купрын, Аляксандр Серафімовіч, Міхаіл Прышвін, Уладзімір Караленка. Юныя чытачы знаёміліся з творамі Рэдзьярда Кіплінга, Жуль Верна, Марка Твэна… Цікавыя рубрыкі і для малых: «Гульні і ручная праца», «У рабочага стала», «Для малютак». Матэрыялы апошняга раздзела друкаваліся буйным шрыфтам і мелі шмат ілюстрацый. Сучасным бацькам карысна пагартаць часопіс «Выхаванне і навучанне» і пазнаёміцца з рускай і замежнай педагогікай, якая практыкавалася сто гадоў таму.

Міра ІЎКОВІЧ

Ад чорнарабочага да рэдактара «Беларускай газеты»

Цярністым быў шлях Алеся Карповіча, якому сёлета споўнілася б 118 гадоў.

Вёска Трашчычы цяперашняга Карэліцкага раёна — яго малая радзіма. Атрымаўшы першапачатковую адукацыю, у 1923 годзе юнак вырашыў ехаць вучыцца ў Прагу. Да яго далучыліся мясцовыя хлопцы — Лявон Шавейка і Юрка Муха. Да Вільні сябры даехалі на цягніку. У Беларускім нацыянальным камітэце не без цяжкасці атрымалі накіраванне на вучобу ў Прагу, дзе ў той час на стыпендыі ўрада Томаша Масарыка вучыліся студэнты з Заходняй Беларусі. Дабіраліся да сталіцы Чэхаславакіі нелегальна. Алесь Карповіч, не зважаючы на ўгаворы віленскіх камітэтчыкаў атрымаць атэстат сталасці на радзіме, разам з сябрамі рушыў у дарогу.

Старшыня пражскага Беларускага камітэта параіў ім спачатку ўладкавацца на работу, але зрабіць гэта было няпроста, бо хлопцы не мелі дакументаў на права пражывання. І толькі з цяжкасцю атрымаўшы пашпарты, пачалі працаваць. Адначасова паступілі на курсы, каб падрыхтавацца да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Алесь Карповіч працаваў чорнарабочым на будоўлі, атрымліваў мізэрны заробак і да таго ж так стамляўся, што не меў ні сіл, ні часу, каб наведваць курсы, таму да экзаменаў яго спачатку не дапусцілі, а прапанавалі рыхтавацца далей. Доўгі час ён нават не пісаў на радзіму сваякам, каб не засмучаць іх дрэннымі весткамі. Праз некаторы час нарэшце дамогся свайго і здолеў стаць студэнтам лясного факультэта Пражскага ўніверсітэта.

Каб лепш зразумець, у якое жыццё акунуўся наш зямляк у Празе, варта ўспомніць, што горад гэты ў той час быў, як і Вільня, сапраўдным цэнтрам беларускага адраджэння. Тут працавалі беларускія арганізацыі, выдаваліся беларускія газеты і часопісы. У 1924 годзе адбылася канферэнцыя беларускіх студэнтаў Заходняй Беларусі і эміграцыі, у якой удзельнічалі прадстаўнікі розных арганізацый. Як сведчаць дакументы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, у спісах членаў студэнцкай секцыі Беларускай грамады (Думкі паступовай), якую ўзначальваў Ксенафонт Бусько, пад нумарам 14 значыцца прозвішча Алеся Карповіча.

Пісьменнікі неаднаразова наведвалі Чэхаславакію. У іх гонар арганізоўвалі вечары, іх творы друкавалі ў газетах і часопісах. Мне ўдалося адшукаць рэдкі фотаздымак, зроблены ў Празе ў 1927 годзе. На яго адваротным баку надпіс: «Прага. 1927 г. 1 рад: Міхась Чарот, Цішка Гартны, Янка Купала, Міхась Зарэцкі, Мікола Шыманка. 2 рад: Алесь Карповіч, Антон Жук, Лявон Шавейка, Міхась Каўцэвіч, Наталля Сазановіч-Орса, Пётр Орса, Юрка Муха».

Здымак мае цікавую гісторыю. Ён належаў карэліцкаму настаўніку Міхаілу Жуку, дзядзька якога, Антон Жук з вёскі Рап'ёва, што на Карэліччыне, у 1920-я гады таксама вучыўся ў Празе і быў добра знаёмы з Алесем Карповічам. Пасля атрымання вышэйшай адукацыі Антон Жук застаўся ў Чэхаславакіі, дзе працаваў інжынерам. На ўскраіне Прагі яшчэ засталіся масты, якія ён збудаваў. Фотаздымак, на якім беларускія пісьменнікі зняліся з беларускімі студэнтамі, Антон Жук перадаў свайму пляменніку летам 1965 года, калі той наведаў яго ў Празе.

Як жа склаўся далейшы лёс Алеся Карповіча? Падчас вучобы ён стаў членам марксісцкай групы. Яе ўдзельнікі не толькі актыўна супрацоўнічалі з чэшскімі газетамі, дзе пісалі пра жыццё простага люду Заходняй Беларусі, але і рыхтавалі праграмы беларускіх вечароў мастацкай самадзейнасці, якія мелі ў гледачоў вялікі поспех.

На летніх канікулах Алесь падзарабляў чорнарабочым на будоўлі, бо стыпендыі не хапала. Праўда, пазней ён пачаў атрымліваць матэрыяльную дапамогу ад дзядзькі з Амерыкі, з якім юнаку ўдалося наладзіць перапіску. Тады ж пазнаёміўся з чэшскай дзяўчынай Ружай і пачаў марыць пра сямейнае шчасце, але надзеі гэтыя не спраўдзіліся.



Алесь расстаўся з нявестай і, скончыўшы вучобу, у 1931 годзе вярнуўся на радзіму, адслужыў у польскай арміі і, завітаўшы ненадоўга дадому, выехаў у Вільню. Думаецца, што далейшы шлях выпускніка Пражскага ўніверсітэта прадвызначыла менавіта яго вучоба ў горадзе, дзе традыцыі беларускага асветніцтва цягнуцца з часоў Францыска Скарыны: не маглі не паўплываць на яго ўспаміны ад сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, знаходжанне ў асяроддзі беларускіх студэнтаў, якія або супрацоўнічалі з чэшскімі газетамі (як Ю. Муха ці М. Шыманка), або прымалі ўдзел у выданні часопіса беларускага студэнцтва (як У. Жылка).

У Вільні Алесь паспрабаваў свае сілы на ніве рэдактара-выдаўца «Беларускай газеты», якая пачала выходзіць у чэрвені 1933 года. У нумары ад 26 ліпеня паведамлялася: «Наша газета пачала сваё існаванне ў надзвычайна цяжкіх матэрыяльных варунках. Першыя нумары яе мы змаглі выдаць толькі дзякуючы ахвярнасці паасобных адзінак з нашага грамадзянства, а перадусім самога рэдактара інж. А. Карповіча».

На старонках газеты друкавалі свае творы заходнебеларускія пісьменнікі: П. Пестрак, М. Танк, М. Васілёк і інш. Цікава, што адным з карэспандэнтаў газеты быў паэт з Карэліччыны Алесь Мілюць, які даслаў у рэдакцыю вершы пад псеўданімам Алесь Нядоля. І хаця вершы ў газеце змешчаны не былі, пачынаючы паэт атрымаў запрашэнне супрацоўнічаць з выданнем.

Але паколькі «Беларуская газета» на чале з рэдактарам на сваіх старонках абараняла інтарэсы працоўных Заходняй Беларусі, прапагандавала ідэю ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, наогул закранала розныя надзённыя пытанні, асобныя яе нумары канфіскоўваліся польскімі ўладамі, а затым, пасля правядзення нелегальнага з'езда заходнебеларускіх пісьменнікаў, які адбыўся ў снежні 1933 года па ініцыятыве газеты, яе выданне наогул забаранілі, а рэдактар трапіў за краты, адкуль выйшаў толькі праз чатыры гады.

Далей лёс таксама не песціў Алеся Карповіча. Напярэдадні і падчас вайны працаваў інжынерам у Навагрудскім лясгасе, а затым у Шчучынскім лясніцтве, за што і быў рэпрэсіраваны. Восем гадоў правёў у сталінскіх лагерах, пасля вызвалення працаваў майстрам на лесанарыхтоўках у Карэліі, а потым выехаў у Варшаву, дзе жылі ў той час яго жонка Каміла і дачка Вольга, з якой бацька, дарэчы, сустрэўся ўпершыню, бо нарадзілася яна пасля яго арышту. У Варшаве і прайшлі яго апошнія гады. У 1960 годзе Алесь Карповіч дабіўся перагляду сваёй справы і быў рэабілітаваны. У лісце да Максіма Танка ад 8 кастрычніка 1961 года былы рэдактар «Беларускай газеты» з горыччу пісаў: «Усё гэта добра, але хто мне верне здароўе, правае вока, хто мяне вылечыць?»

Памёр Алесь Карповіч 10 мая 1986 года, пахаваны ў Варшаве.

Аднавіць біяграфію нашага земляка ўдалося на падставе архіўных дакументаў, у тым ліку матэрыялаў судовай справы і ўспамінаў яго брата Яфіма, іншых сваякоў.

Святлана КОШУР

ГАСПАДАР «МЯДОВАГА КУТА»

Артур Папок — чалавек, які знайшоў сэнс жыцця і сябе ў вёсачцы Алянец на Смаргоншчыне

Ці памятаеце, чым заканчваецца раман Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»? Дазвольце, нагадаю. Юрась Братчык, ён жа мужыцкі Хрыстос, пасля ўсіх прыгод пасяліўся разам з жонкай Анеяй на сваёй зямлі, на хутары, дзесьці на мяжы Белавежы з Палессем. І жылі яны вольным жыццём, здабываючы хлеб надзённы ўласнымі рукамі ў чаканні святла. Так і мой добры знаёмы, майстар спорту па вольнай барацьбе, спецыяліст у галіне фінансаў, палітолаг Артур Папок, паспытаўшы ў жыцці шмат чаго, аднойчы з'ехаў з шумна-вірлівага Мінска ў вёсачку Алянец Смаргонскага раёна, дзе і пачалося іншае жыццё, якое ён смакуе напоўніцу.

Хатка пабудовы 1939 года на выселках Алянца спадабалася яму яшчэ 15 гадоў таму, калі працаваў на фірме ў суседнім Залессі. Гэта месца казачнай прыгажосці ў атуленні старажытнага лесу, за якім нясе свае воды авеяная легендамі Вілія, а па-мясцоваму Вялля. Адразу за падворкам — старыца-балотца, куды штолета прылятаюць белыя чаплі — птушкі, на думку Артура, па грацыёзнасці нашмат прыгажэйшыя, чым ружовыя фламінга. Нават смарагдавы мох на даху надае прывабнасць хаце.

Грошай хапіла, каб набыць пабудову, але каб адрамантаваць, добраўпарадкаваць і пашырыць да аграсядзібы, не было... Усе гэтыя гады Артур шукаў магчымасць зарабіць у сталіцы і нават за мяжой. Ды нешта заўжды не атрымлівалася… А вясковы падворак часта сніўся, нібы крыўдуючы на нядбайнага гаспадара. Аднойчы ён прыехаў і… застаўся назаўжды.

— Я раптам зразумеў, што ніколі не зараблю вялікіх грошай, як мне хацелася, таму пачынаў без стартавага капіталу, крэдытаў, спонсараў, разлічваў толькі на ўласныя сілы, веды і вялікае жаданне мець жытло ў гэтым маляўнічым месцы, — распавёў Артур Папок.

Урбаністычныя схільнасці паступова саступалі месца вясковаму ўкладу, якога мінчук зусім не ведаў. Вакацыі ў сяле ўкраінскай бабулі ў разлік не бяруцца, бо прападаў хлопец там выключна на стайні, дзе з задавальненнем даглядаў коней. Таму інакш, як экстрымам, такую змену жыцця не назавеш. Але, лічыць Артур, кожны з нас здольны на многае, калі не лянуецца і ўмее выкарыстоўваць веды, досвед ці шукаць патрэбную інфармацыю ў першакрыніцах, інтэрнэце.

Сёння грошы на жыццё Артур зарабляе анлайн-выкладаннем польскай мовы, перакладамі з польскай і на польскую, з беларускай і на беларускую. Харчуецца, за малым выключэннем, натуральнымі прадуктамі з уласнага агарода і пчальніка. Жывёлу не трымае, бо займаецца будоўляй і добраўпарадкаваннем. Дарэчы, ад першапачатковай мары стварыць тут рэкрэацыйную аграсядзібу з мядовай лазняй Артур не адмаўляецца. І назва адпаведная ёсць — «Мядовы кут».

Змяніўшы статус гарадскога

жыхара, наш герой тэмп жыцця не памяняў. Яго дзень пачынаецца а шостай гадзіне з сілавой гімнастыкі, а потым цэлы дзень, як Артур кажа, «фітнес»: каса, сякера, рыдлёўка… Ён упарта і мэтанакіравана будуе сядзібу: сам робіць няхітрую мэблю, рэстаўрыруе старую. Працаваць з дрэвам любіў заўсёды. Адзін з бізнесаў, якім займаўся раней, — вытворчаць драўляных дзвярэй. На сядзібе свае навыкі значна ўдасканаліў. А калі зразумеў, што са старой печкаю трэцюю зіму не перазімуе, сам яе і адрамантаваў! Маці, Тамара Васільеўна, якая летні адпачынак бавіць на сынавай сядзібе, неяк прыгадала, што яго дзяды дасканала валодалі гэтымі прафесіямі. Артур смяецца, што чакры на свежым паветры адкрыліся, і спадчынныя ўменні праявіліся ва ўнуку.

Неўпрыкмет вырас другі паверх над будынкам былога хлява, дзе будзе лазня. У вокны зазіраюць дубы.

Артур прызнаецца, што дарос да класічнай музыкі і ўвечары адкрывае для сябе новыя імёны кампазітараў і космас іх творчасці. Чалавек жыве з асалодай і ў поўнай гармоніі з наваколлем...

І ўсё ж як бы ні паэтызаваў мой суразмоўца свой лад жыцця, складана было паверыць, што гэта мяжа яго мар. Разбіў мой недавер Артур пераканаўчай рэплікай на развітанне:

— Чалавеку насамрэч для шчасця многа не трэба. Задавальняць свае патрэбы, мець нейкую статуснасць, пражываючы ў сталіцы, зарабляць шмат грошай — хіба ў гэтым шчасце? Навошта табе грошы, калі ты не можаш рабіць дабро? Навошта багацце, якое акрамя галаўнога болю нічога не дае? Я маю чыстую ваду, свежае паветра, якім дыхаю не надыхаюся. Побач — лес, дзе грыбы і ягады. Рака, дзе ёсць рыба. Сябры прыязджаюць і зайздросцяць, радуюцца хараству навакольнай прыроды. Я больш не хачу ў гарадскую мітусню! Мне камфортна, бо я тут запатрабаваны. Я тут жыву!

Халодны дожджык насычаў паветра вільгаццю, смарагдавы дах стагадовай хаткі выпраменьваў зялёнае святло, якое неўпрыкмет вібрыравала пад гукі «Метамарфоз» Філіпа Гласа, што выплывалі з прыадчыненых дзвярэй, каля якіх стаяў і шчасліва ўсміхаўся гаспадар — чалавек, які знайшоў сэнс жыцця, знайшоў сябе.

Ала КЛЕМЯНОК,
фота аўтара

Як шчэпавая птушка шчасця

стала нацыянальнай каштоўнасцю Беларусі і сімвалам Бярозаўскага раёна

Традыцыя вырабу птушкі-абярэга з расшчэпленай драўніны існуе ў гэтым палескім куточку не адно стагоддзе. І з часам яна набыла адметныя рысы і форму, якія надаюць птушцы лёгкасць і здольнасць рэагаваць на самы нязначны рух паветра. Абрысамі ўнікальны выраб нагадвае матуліну далонь альбо сонечны дыск, што ахінае чалавека і аберагае ад злых сіл.

Птушку выраблялі і як забаўку для дзіцяці. Яна ахоўвала ад «дрэннага вока» і іншых няшчасцяў, а ў часы вялікіх свят ёю ўпрыгожвалі покуць. Падвешвалі пад столь на Каляды: лічылася, што ў гэты час жыллё найбольш неабароненае ад злых чараў. Пасля святаў драўляную птушку спальвалі ў печы, каб з дымам сышло з хаты ўсё нядобрае.

Работа Мікалая Галабурды.

Сёння ўнікальны выраб выкарыстоўваюць для аздаблення інтэр'ераў і як сувенір, які адлюстроўвае этнічную спецыфіку гэтага палескага рэгіёна. Дакладней, у вёсках Галавіцкія, Перасудавічы, Стаўкі, Судзілавічы, Шылін Бярозаўскага раёна. А таксама ў вёсцы Заверша Драгічынскага раёна. Тры гады таму тэхналогія вырабу шчэпавай птушкі-абярэга, характэрная для Бярозаўскага раёна, была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Як жа ствараецца ўнікальны сімвал?

— Для вырабу птушкі падыходзяць свежаспілаваныя асіна, вольха ці ліпа. Адпілоўваюцца чурачкі з роўнай структурай валокнаў, якія расколваюцца сякерай на дошчачкі ўздоўж па валокнах. Атрыманую нарыхтоўку абстругваюць з усіх бакоў і дзеляць на часткі згодна з памерамі птушкі, — распавяла дырэктар Бярозаўскага раённага Цэнтра рамёстваў Наталля Кавалевіч. — Потым майстар бярэ два тоненькія брусочкі і нож з тонкім і вострым лязом. З першага бруска ствараюцца галава, тулава і хвост птушкі, з другога — крылы. Што да крылаў, то спачатку майстар выразае ўзор — замок — упрыгожванне перынак, затым абодва канцы брусочка расшчапляе ўздоўж валокнаў як мага танчэй і па магчымасці на большую, але аднолькавую колькасць перынак, а затым разводзіць у бок — у напрамку хваста. Пажадана, каб у кожным крыле атрымалася больш як дзесяць перынак. Калі абедзве часткі збіраюцца ў птушку, то разам з перынкамі хваста змыкаюцца ў кола. Дасканалая і прыгожая форма птушкі адчувальная да самага маленькага павеву паветра.

На жаль, птушкі старога вырабу не захаваліся, але на тэрыторыі раёна яшчэ ёсць людзі, якія ўмеюць іх выраблаць і памятаюць, як такіх птушак стваралі ў пачатку мінулага стагоддзя. Сяргей Юркевіч, што жыве ў Бярозе, навучыўся рабіць іх самастойна, гледзячы на старых майстроў, і ўжо 40 гадоў удасканальвае сваё майстэрства. Дарэчы, Сяргей Юркевіч удзельнічаў у І Рэспубліканскім конкурсе рэзчыкаў па дрэве, які ладзіў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці дваццаць гадоў таму, і стаў яго пераможцам у намінацыі «Дзіцячая цацка».

— Метадыст нашага цэнтра рамёстваў Аляксандр Лаўрыновіч ужо сем гадоў авалодвае сакрэтамі стварэння шчэпавай птушкі, а з пачатку 2013 года праводзіць майстар-класы па вырабе птушкі — як у цэнтры, так і на выязных майстар-класах, — зазначае Наталля Іванаўна. — Сёння не толькі Аляксандр Лаўрыновіч, Сяргей Юркевіч, але і Аляксандр Пракапчук з'яўляюцца

Работа Аляксандра Пракапчука.

пераемнікамі сакрэтаў рамяства, вырабляюць класічныя формы птушкі з адметнымі асаблівасцямі, характэрнымі для індывідуальнай творчасці. Нашы майстры рэгулярна ўдзельнічаюць у розных выстаўках, бяруць удзел у святах народнай творчасці, бо драўляная птушка вабіць вока як малых, так і дарослых.

Сённяшнія носьбіты ўнікальнай традыцыі імкнуцца перадаць майстэрства моладзі, таму што лічаць сваё ўменне ўнікальнай каштоўнасцю, якая не павінна згінуць у імклівым сучасным свеце. Першасная задача для маладых — адаптаваць шчэпавую птушку да сучаснасці.

— Што асабліва радуе і здзіўляе — сакральнасць і незвычайнасць птушкі асабліва адчуваюць дзеці, — заўважыла Наталля Кавалевіч. — Ва ўсе часы было важна далучыць новае пакаленне да старажытных ведаў продкаў, бо забывацца пра іх — гэта ўсё роўна што не звяртаць увагу на існуючую сувязь пакаленняў. Адраджаючы старажытныя традыцыі, мы далучаемся да незаслужана забытых ведаў, успамінаем свае карані: хто мы і дзе наша малая радзіма з яе багатымі традыцыямі, звычаямі і дзіўнымі для камп'ютарнага веку рамёствамі.

Раіса МАРЧУК
Фота Наталлі Кавалевіч.

Скарбонка Спадчыны

Фота Сяргея Жылліка.

«Нявесцін камень»

аказваў і працягвае аказваць уплыў на духоўнае развіццё Ашмянскага раёна

Валун родам з Аланскіх астравоў Балтыйкага мора — самы знакаміты з камянёў на тэрыторыі Ашмянскага раёна. Навукоўцы вызначылі, што яго вага — каля 74 тон. З'явіўся «Нявесцін камень» на гэтай зямлі прыблізна 18—20 тысяч гадоў таму. Каштоўнасць помніка прыроды для мясцовага культурнага асяроддзя не толькі ў яго памерах, але і ў шматлікіх міфах ды легендах, звязаных з ім.

Традыцыя шанавання валуна захавалася да нашых дзён у паўсядзённым жыцці мясцовых жыхароў і грунтуецца на вераваннях вяскоўцаў — носьбітаў традыцыі і перакананнях жыхароў рэгіёна (і не толькі!) у цудадзейных уласцівасцях каменя. Два гады таму традыцыя шанавання вялізнага двухметровага валуна «Нявесцін камень» з ружовага граніту каля вёскі Агароднікі ва ўрочышчы Рамбоўскі Роў была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

— Сутнасць шанавання валуна мясцовымі жыхарамі праяўляецца ў ахвяраваннях яму абрусоў, стужак, ланцужкоў, дробных грошай, цукерак, прадметаў асабістага ўжытку, — распавёў метадыст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Ашмянскага раённага цэнтра культуры Сяргей Жылік. — Маладыя наведваюцца сюды, каб папрасіць шчаслівага і заможнага сямейнага жыцця, маладыя жанчыны — каб нарадзіць доўгачаканае дзіця, дзяўчаты — каб знайсці добрага жаніха. Сталыя жанчыны просяць шчаслівай долі для дачок. Многія спяшаюцца ва ўрочышча, каб вылечыцца ад цяжкіх хвароб. Паводле слоў старажылаў, раней да каменя прыходзілі маладыя перад тым, як узяць шлюб. Паклаўшы ахвяру на валун або павязаўшы стужку ці ручнік на дрэва, трэба дакрануцца да каменя і моцна папрасіць яго выканаць жаданне. Дакладнага часу наведвання сакральнага месца не існуе. А сама традыцыя шанавання не суадносіцца ні з якімі святамі.

Усе гэтыя фактары сведчыць пра тое, што традыцыя шанавання валуна «Нявесцін камень» аказвала і працягвае аказваць уплыў на духоўнае развіццё рэгіёна, фарміраванне яго своеасаблівасці. А яшчэ гэты элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны і яго атрыбуты маюць, безумоўна, вялікае краязнаўчае, турыстычнае і сакральна-культурнае значэнне.

Як паведамілі ў Ашмянскім райвыканкаме, дзякуючы рэалізацыі праекта міжнароднай гуманітарнай дапамогі, тэрыторыя вакол каменя была добраўпарадкавана. Супрацоўнікі раённай бібліятэкі зладзілі этнаграфічную экспедыцыю, запісалі аповеды старажылаў і сабралі цікавы матэрыял, потым правялі навукова-практычную канферэнцыю «Валуны — маякі гісторыі», апублікавалі шэраг даследчых работ. Каля валуна ўстанавілі адпаведны інфармацыйны стэнд. Сёння «Нявесцін камень» — месца паломніцтва не толькі жыхароў нашай краіны, але і замежжа.

— У апошняе дзесяцігоддзе назіраецца рэзкі ўздым яго папулярнасці, — зазначыў Сяргей Жылік. — Да «Нявесцінага каменя» зноў пачалі прыязджаць маладыя замацаваць свой шлюб, каб ён быў такі ж трывалы, як тысячагадовы валун. На камені шмат ахвяраванняў: грошы, кветкі, завушніцы, ланцужкі, а на навакольных дрэвах вісяць матузкі, ручнічкі ды стужкі. Гэта прыклад сучаснай міфалагізацыі і новай традыцыі шанавання валуна.

Раіса МАРЧУК

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснік галоўнага рэдактара — 377-99-72
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 377-99-72
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
28.11.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 942

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 3777

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.